М. В. Жуковіч

# Літаратурнае чытанне



3

Частка 2

# СЛОЎНІК-ПАМОЧНІК ДЛЯ ВЫЗНАЧЭННЯ НАСТРОЮ

**вясёлы,**
радасны, шчаслівы, узнёслы;

**добры,**
спакойны, мірны, задаволены;

**сумны,**
трывожны, расчараваны, вінаваты;

**незадаволены,**
раўнадушны, злосны, разгневаны



# СЛОЎНІК-ПАМОЧНІК ДЛЯ ВЫЗНАЧЭННЯ ІНТАНАЦЫІ

**бойкая,**
звонкая, заклікальная;

**сардэчная,**
стрыманая, спакойная;

**пяшчотная,**
ласкавая, прыветлівая;

**усхваляваная,**
трывожная, баязлівая;

**раўнадушная,**
сур'ёзная, сярдзітая

# СЛОЎНІК-ПАМОЧНІК ДЛЯ ВЫЗНАЧЭННЯ СТАНОЎЧЫХ РЫС ХАРАКТАРУ ГЕРОЯЎ ТВОРА

дабрыня, добразычлівасць
сумленнасць
сціпласць
пакладзістасць
працавітасць
адказнасць
ветлівасць
смеласць, адвага, мужнасць
шчодрасць
шчырасць

# СЛОЎНІК-ПАМОЧНІК ДЛЯ ВЫЗНАЧЭННЯ АДМОЎНЫХ РЫС ХАРАКТАРУ ГЕРОЯЎ ТВОРА

злосць
хітрасць
нахабнасць, ганарлівасць
нявытрыманасць
гультайства
бяздумнасць
грубіянства
баязлівасць
пасіўнасць
сквапнасць



М. В. Жуковіч

# Літаратурнае чытанне

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Мінск

Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)
ББК 88.3(4Беи)я71
Ж86

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра дашкольнай і пачатковай адукацыі педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Н. В. Крыцкая*);

намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 3 імя В. З. Каржа г. Пінска», настаўнік пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» *В. Б. Атліванава*

## Умоўныя абазначэнні:



— пытанні і заданні;



— тлумачальны слоўнік;



— работа ў парах (групах).

ISBN 978-985-893-312-8 (ч. 2)
ISBN 978-985-893-310-4

© Жуковіч М. В., 2017
© Жуковіч М. В., 2023, са змяненнямі
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

Правообладатель Национальный институт образования

# ДОБРАЕ ДЗІЦЯ БАЦЬКОЎ ДУМКІ ЗГАДВАЕ



**Мы пазнаёмімся** з цікавымі і павучальнымі творамі пра ўзаемаадносіны дзяцей і бацькоў у сям'і, пра клопат і павагу ў ёй.

**Мы працягнем вучыцца:**

- ✓ вызначаць персанажаў у прачытаных творах, выказваць свае адносіны да іх;
- ✓ тлумачыць учынкі дзейных асоб;
- ✓ разумець, у чым заключаецца асноўная думка прачытаных твораў;
- ✓ выразна чытаць вершы, перадаваць іх настрой;
- ✓ падрабязна пераказваць змест прачытаных апавяданняў і казак.

**Варта задумацца.** Якія рысы характару варта выхоўваць у сабе, каб стаць добрым чалавекам, сапраўдным грамадзянінам сваёй краіны?



Правообладатель Национальный институт образования

***Не даць ра́ды*** — тут: не справіцца з кім-небудзь.
***Даліка́тны*** — ветлівы, ласкавы ў абыходжанні з людзьмі.
***Корч*** — пень, які вывернуты з зямлі з карэннем.
***Выскаля́цца*** *(разм.)* — насміхацца, здзекавацца.
***Капшу́к*** — мяшочак для тытуню, які сцягваецца шнурком; кісет.

## Недалікатны сын

*Беларуская народная казка*

Жыў у аднаго чалавека сын. Вялікі ўжо вырас, а ніколі бацьку бацькам не называў.

— Кузьма, — крычыць сын на бацьку, — ідзі ара́ць! Кузьма, загані свіней у хлеў!

Крыўдна бацьку, ды што зробіш: малога не перавучыў, а цяпер і рады не дасі.

Смяюцца людзі з Кузьмовага сына.

— Дурань, — кажуць, — як гэта можна, каб бацьку не паважаць!

А яму хоць бы што: не слухае ні бацькі, ні людзей.

Аднаго разу паехаў Кузьма з сынам па сена. Наклалі вазы ды едуць дахаты: бацька на адным


Правообладатель Национальный институт образования

возе, сын — на другім. Мінулі гладкую дарогу, уехалі ў лес. Тут пайшлі карчы́ ды выбоіны.

Злез бацька з сена, ідзе збоку, за возам наглядае, каб не абярнуўся. А сын ляжыць на сваім возе ды толькі камандуе:

— Кузьма, вунь яма — падтрымай воз! Кузьма, правядзі маю кабылу па ўзбочыне, а то кола за корч зачэпіцца!

Бегае бацька ад воза да воза, не можа ўправіцца. А сын толькі выскаля́ецца з яго:

— Маладзец, Кузьма! Добра стараешся.

Узлаваўся бацька і перастаў бегаць да сынавага воза.

У адным месцы сынаў воз трапіў у высокую выбоіну і перакуліўся... Сын шлёпнуўся носам у гразь.





Правообладатель Национальный институт образования

Устаў ён і лае бацьку:

— Бачыш, Кузьма, што ты нарабіў!

Паднялі воз і паехалі далей. Сын ужо і на сена не палез. Ідзе збоку ды ўсё бурчыць на бацьку.

Даехалі да крутога павароту. Бацька свой воз падпёр плячом і аб'ехаў паварот, а сын пашкадаваў сілы траціць. Воз перакуліўся і падмяў яго пад сябе.

— Кузьма! — крычыць сын з-пад сена. — Падымі воз!

Маўчыць бацька як вады ў рот набраўшы. Дастаў з кішэні капшук, закурыў люльку. «Паляжы ж там, калі ты такі разумны», — думае бацька.





Правообладатель Национальный институт образования

Клікаў, клікаў сын Кузьму, а той як аглух. Сыну ўжо і дыхаць цяжка. Напалохаўся ён, заенчыў не сваім голасам:

— Бацька, ратуй!

---

Пафантазіруйце, як будуць развівацца падзеі далей.

---

Зарадаваўся Кузьма, што сын нарэшце-такі назваў яго бацькам. Падняў воз і кажа да сына, усміхаючыся:

— На свеце, брат, жывучы́, усяго нажыве́ш — і Кузьму бацькам назаве́ш!

З таго часу і пайшла гэта прыказка.

1. Назавіце дзейных асоб казкі.
2. Як называў сын бацьку?
3. Растлумачце сэнс выразаў: «выскаляецца з яго», «шлёпнуўся носам у гразь», «бурчыць на бацьку».
4. Што прымусіла сына назваць Кузьму бацькам?
5. Значэнне якой прыказкі раскрываецца ў творы? Прачытайце. Як вы разумееце яе сэнс?
6. Якая асноўная думка казкі? Патлумачце.
7. Чаму гэты твор з’яўляецца казкай? Што ў ім казачнае?
8. Разгледзьце ілюстрацыі на с. 5 і 6. Суаднясіце іх з тэкстам: знайдзіце пачатак і канец урыўкаў, якія праілюстраваны.



Правообладатель Национальный институт образования

9. Вызначце часткі твора: зачын, асноўную частку і канцоўку.
10. Дайце загаловак кожнай з іх.
11. Па складзеным плане перакажыце змест казкі.

## ПРЫКАЗКІ

- Хто бацькоў шануе, той і дзецям добрую долю гатуе.
- Бацькоў слухаць — гора не знаць.
- Самая балючая рана ад свайго дзіцяці.

### У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Уладзіміра Масленікава «Сям’я».





Правообладатель Национальный институт образования

**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Каго вы бачыце на карціне?

2) Якія твары ў бацькоў і дзяцей? Чаму, на вашу думку, дзеці задаволеныя і ўсміхаюцца?

3) Чаму бацька адлюстраваны больш задумлівым і сур’ёзным? Паразважайце.

4) Ці спадабалася вам гэта карціна? Чаму?

5) Які настрой яна ў вас выклікала?

***Гасці́нец*** — падарунак (звычайна які-небудзь ласунак).
***Ста́йня*** — памяшканне для коней, канюшня.
***Пра́гны*** — скупы.

## Зайздросны дзядзька

*Беларуская народная казка*

Жылі два браты: адзін бедны, другі багаты. Бедны, паміраючы, сказаў сваім сынам-падлеткам:

— Глядзіце на дзядзьку: што ён будзе рабіць, тое рабіце і вы.

Так сыны і рабілі, як бацька навучыў.

Добра сталі жыць браты. А дзядзька аж чарнее ад за́йздрасці: гэтак, чаго добрага, пляменнічкі стануць багацейшыя за яго!



Правообладатель Национальный институт образования

Пайшоў аднаго разу да дзядзькі меншы брат даведацца, што ён заўтра будзе рабіць. А дзядзька і кажа:

— Буду двор каля хлявоў капаць...

Вярнуўся брат і расказаў старэйшаму, што іх дзядзька збіраецца рабіць.

— Добра, — кажа брат, — будзем і мы двор капаць.

Капну́лі браты разоў колькі і знайшлі цудоўны камень — блішчыць, як сонца!

Пакруцілі хлопцы камень у руках — не ведаюць, што гэта такое.

— Занясём яго пану, — кажа старэйшы брат. — Можа, ён ведае.



Узяў пан камень і даў хлопцам за яго цэлы воз збажыны.

Зажылі браты яшчэ лепш, чым раней. А дзядзьку яшчэ большая зайздрасць грызе.

— Скажыце, — пытаецца ён у хлопцаў, — чым гэта вы дагадзі́лі пану, што ён вам гэтулькі збажыны не пашкадаваў?

— А нічым асаблівым, — кажа старэйшы брат. — Даведаліся, што пан вельмі лю-



Правообладатель Национальный институт образования

біць на абед жаб. Ну, налавілі мы іх цэлую торбу ды і прынеслі яму як падарунак. За гэта ён нас і ўзнагародзіў.

Пабег зайздросны дзядзька на балота, налавіў цэлы мех жаб і павалок пану. Прыйшоў і кланяецца:

— Добры дзень, панок!

— Ну, што скажаш, Кузьма? — пытаецца пан.

— Ды вось прынёс пану гасцінец.

— Які гасцінец?

— Такі, як пляменнікі прыносілі. Хачу таксама мець ад пана ўзнагароду.

Развязаў Кузьма мех і высыпаў на панскі стол свой гасцінец...

Пан так і падскочыў разам з крэслам.

— Ах ты, нягоднік! — закрычаў ён. — Дык ты з мяне жартаваць надумаўся? Гэй, слугі! На стайню яго!

Схапілі панскія слугі пра́гнага дзядзьку, пацягнулі на стайню ды так яго ўзнагародзілі, што ён ледзьве ачу́хаўся.

1. Чаму бедны брат наказаў сваім сынам браць прыклад з дзядзькі?
2. З-за чаго дзядзька не сказаў праўды пляменнікам пра свае планы на заўтрашні дзень? Як гэта яго характарызуе?



Правообладатель Национальный институт образования

3. За што пан даў хлопцам цэлы воз збажыны?
4. Чаму пляменнікі падманулі свайго дзядзьку?
5. Патлумачце сэнс выразу «ледзьве ачýхаўся».
6. Што асуджаецца ў казцы?
7. Якая прыказка выказвае асноўную думку казкі?
   - Ад добрага не ўцякай і ліхога не рабі.
   - Хітрэйшы за ўвесь свет не будзеш.
   - Як ён да людзей, так і людзі да яго.
8. Разгледзьце ілюстрацыю да твора на с. 10. Хто, на вашу думку, ідзе да пана — адзін з братоў ці дзядзька? Дакажыце.
9. Падрыхтуйце пераказ казкі.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце гукі [дз’], [г], [ч], [р], [ў] і [ц’].

## Мой дзядуля

Я **дз**ядулем **г**ана**р**уся,
З ім ні**ч**ога не баюся,
Дапаможа ён, падкажа,
Шмат займальна**г**а **р**аскажа.
У **ц**ікавыя паходы
Ён бя**р**э мяне за**ў**сёды.
Любім мы з мя**ч**ом **г**уля**ц**ь,
Кніжкі новыя **ч**ыта**ц**ь…

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Грэ́баваць*** — пагарджаць кім-небудзь, чым-небудзь, выказваць непавагу, непрыхільнасць да каго-небудзь, чаго-небудзь.
***Свяшчэннадзе́йства*** — тут: выкананне бытавых традыцый (іранічнае).
***Завядзёнка*** — звычай, традыцыя.



## ІВАН МУРАВЕЙКА

## Лыжкай па лбе

Ну дык вось. Аднойчы ўся наша сям'я — дзед Апанас, мая мама і мой тата, я і мой старэйшы брат Янка — села за стол абедаць. А елі тады ўсе з адной міскі. Гэта цяпер розных талерак, сподачкаў, місачак, ке́ліхаў — усе шафы і камоды набіты, а ў той час... На пальцах пералічыш. Лыжкі былі драўляныя, з бярозы. Па-мойму, дарэмна цяпер грэбуюць імі. Драўляная лыжка лепей металічнай — яна ў самай гарачай стра́ве не становіцца гарачай.

Гэта — да слова. Я хачу пра іншае расказаць. Прыём стравы лічыўся не проста штодзённай патрэбнасцю, а найвышэйшай урачы́стасцю, свяшчэннадзе́йствам. І яго павінен быў зачынаць старэйшы ў сям'і. Такая была завядзёнка і ў нашай хаце. Пакуль дзед не возьме скі́бачку



Правообладатель Национальный институт образования



хлеба, ніхто не меў права пачынаць яду. А Янка аднаго разу не сцярпеў, мабыць, прагаладаўся дужа — першым акунуў сваю лыжку ў капусту (у той дзень на абед мама наварыла капусты). Сербануў, і вочы яго пачырванелі.

— Ну, як, не надта гарачая капуста? — запытаў дзед.

Янка моўчкі пакруціў галавой: маўляў, нармальная.

Дзед зачарпнуў поўную лыжку капусты... Усе заўважылі, што і ў дзеда, як і ў Янкі, пачырванелі вочы, нібы ў іх нехта запаліў агеньчыкі. Мы з напружаннем чакалі, чым закончыцца гэты незвычайны паядынак паміж дзедам і ўнукам. «Няўжо нічым? Шкада», — падумаў я. Мне хацелася, каб адбылося што-небудзь такое...



Правообладатель Национальный институт образования

Пафантазіруйце, што можа адбыцца.

І адбылося. Дзед павольна ўстаў і — бац лыжкай па Янкавым ілбе. Узяў нож і падаў яго Янку.

— Прыкладзі, каб гузак не ўсхапіўся.

1. Хто ўваходзіў у склад сям'і? Прачытайце.
2. Якія словы сведчаць, што падзеі, апісаныя ў творы, адбываюцца ў даўнія часы?
3. Якія правілы строга выконваліся ў сям'і? Чаму? Адказ падмацуйце радкамі з твора.
4. Чаму Янка аднойчы парушыў завядзёнку і першым акунуў сваю лыжку ў капусту?
5. За што дзед Апанас стукнуў унука па лбе лыжкай?
6. Якія думкі ўзніклі ў вас, калі дзед падаў унуку нож і сказаў: «Прыкладзі, каб гузак не ўсхапіўся»? Як гэта характарызуе старога?
7. Паразважайце, ці доўга Янка будзе крыўдзіцца на дзеда. Чаму? (Глядзіце форзац 1.)
8. Які эпізод з апавядання адлюстраваны мастаком на с. 14? Прачытайце адпаведныя радкі.
9. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора. (Глядзіце форзац 1.)

**Давайце абмяркуем.** Успомніце, якія жыццёвыя ўрокі вы атрымалі ад сваіх родных. Раскажыце пра традыцыі, якія захоўваюцца за сталом у вашай сям'і.



Правообладатель Национальный институт образования

***Абхо́д*** — участак лесу (адзін або некалькі кварта́лаў), які даглядаецца адным леснікам.
***Ста́лы*** — які стаў дарослым, дасягнуў поўнага развіцця.
***Патра́ва*** — знішчэнне або псаванне пасеваў, траў жывёлай.
***Зы́каваць*** — моцна, голасна падаваць гукі.
***Рахма́ны*** — ручны, свойскі (пра жывёлу).
***Сві́тка*** — доўгая сялянская верхняя вопратка з даматканага сукна.
***Кужэ́льны*** — пашыты з ку́жалю (з ільнянога палатна).
***Кра́мны*** — куплены ў магазі́не.
***Працерабі́ць прасе́ку*** — тут: зрабіць праход сярод кустоў.



## ІВАН ШАМЯКІН

## Пастух

Пакуль я быў малы́, бацька наймаў пастушка, каб пасвіў лесніковы каровы. А як пайшоў мне восьмы год, бацька сказаў:

— Усё, сын. Хопіць табе гойсаць. У гэтае лета будзеш пасвіць сваю чараду́. Пастух дорага абыходзіцца. Кармі яго, плаці хлебам ці сенам.



Правообладатель Национальный институт образования

Стаяла зіма, ляжаў глыбокі снег. У леснічоўцы нам дваім з братам было адзінока: у той час бацьку перавялі на другі абход, пад вёску Краўцоўку. Там у сасновым бары стаяла адзінокая хата лесніка. І зімою я з нецярпеннем чакаў вясны, уяўляў, як паганю статак у лес і нічога не буду баяцца — ні ваўкоў, ні зладзеяў. Уяўляў сябе ста́лым пастухом і радаваўся, што мне даручаць такую адка́зную працу. Папрасіў дзядзьку Трышку, які прыехаў да нас з далёкай Кармы́, прывезці мне пу́гу. Дзядзька смяяўся:

— Дзе ты ёй ляскаць будзеш, пугай той? Па кустах? Заматаецца за дрэвы.

Па ранняй вясне, пакуль было холадна і мокра ў лесе, маці пасвіла сама: шкадавала малога; яна ўвогуле была супраць таго, каб так рана рабіць мяне пастухом.

— Дзіця горкае, — выцірала слёзы, гледзячы на нашы з Паўлам за́баўкі.

Але ўрэшце наступіў мой першы працоўны дзень. Не зусім на світанку, але вельмі рана, сонца яшчэ не асвяціла леснічоўку, маці доўга будзіла мяне. О, як не хацелася паднімацца так рана! Вочы зліпаліся, галава сама валілася на падушку. Бацькаў голас падняў: бацькі я баяўся. Абулі мяне ў лапцікі, у світачку, торбачку праз плячо павесілі з хлебам і маслам



Правообладатель Национальный институт образования

у шклянцы — каб паснедаў, бо так рана есці не хацелася. І пагнаў я каровы.

За адну першую раніцу развеяліся ў дым усе мае зімнія мары і фантазіі. Я зразумеў, якая гэта невыносная, паку́тлівая праца — пасвіць каровы такому малому. Вясна была мокрая. Камароў развялося — хмары цёмныя, яны клубка́мі віселі над жывёлай. Цёлкі і бычкі адразу рванулі ў гушчар, у кусты, ратуючыся ад камарэчы. Я не мог іх сабраць у адну чараду. Згубіў некаторых. А помніў строгі бацькаў наказ:

— Глядзі, каб у поле не выскаквалі, патра́ву не зрабілі. За патраву з краўцоўцамі не разлічышся.

А цёлкі, бычкі якраз і рваліся туды — у поле, бо там вецер разганяў камароў, ды і жыта, ячмень смачнейшыя за лясную траву.

Вярнуўся я без чарады. Баючыся бацькі, у хату не заходзіў — плакаў за хлявом, каб пачула маці. Пачула. Заплакала сама. Знайшла кароў. Памагла мне пасвіць.

Такое па́свенне паўтаралася пасля даволі часта. Маці прасіла бацьку наняць больш дарослага пастуха. Але бацька быў няўмольны. Ды і я патроху асвойваўся са сваімі пастушынымі абавязкамі.

Наступала спякотнае лета. Адышла камарэча і машкара. Авадні даймалі не так. Ад іх бычкі



Правообладатель Национальный институт образования

і цёлкі зы́кавалі. Але зыкі больш смяшылі, чым рабілі клопату. І я бада́й палюбіў сваё пастухоўства. Адзіноцтва палюбіў. І кароў, цёлак, бычкоў палюбіў. Яны зрабіліся маімі сябрамі. Я гутарыў з імі і верыў, што яны разумеюць мяне і адказваюць ры́каннем на розныя лады. Асабліва я сябраваў з цёлкай Майкай, нашай двухгодкай. Яна была вельмі рахма́ная і ласкавая. Я абнімаў яе за шыю. Яна нават дазваляла сесці на яе, як на каня, і пракаціцца па паляне. Праўда, часам Майка паступала непрыгожа, не як сябра. Калі я садзіўся паснедаць і, прыгрэўшыся на сонцы, засынаў, бо вельмі ж рана ўставаў, Майка з'ядала мой хлеб і нават вылізвала са шклянкі масла — ласунак мой.





Правообладатель Национальный институт образования

Аднойчы я забаўляўся з Майкай, а яна матнула галавой і... ударыла рогам мне ў жывот, не балюча: рог быў тупы, бацька падразаў усе вострыя рогі, бо раней адна карова прабіла другой бок так, што раненую прыйшлося прырэзаць. Але Майка гэтым тупым рогам падчапіла пад папру́жку. І падняла мяне. І панесла на здзіўленне ўсім каровам. Я матляўся на яе розе, махаючы рукамі і нагамі. Але не толькі мне хацелася вызваліцца з такога раптоўнага палону. Майцы таксама хацелася скінуць мяне з рога. І яна — мела розум! — палезла ў самы гушчар. Церла мяне аб кусты, ажно працерабіла там прасеку жывой ношкай. Невядома, чым бы гэта скончылася, але, на шчасце, папружка лопнула, і я чмякнуўся на зямлю. Майка задаволена чмыхнула і пабегла да чарады. А я... што сталася са мной! Ад штонікаў маіх кужэльных і сарочачкі крамнай віселі адны шматкі. Усё цела было падрапана, акрываўлена. Шчасце, што вочы сучча не вы́калала.

Калі прыбег дадому, маці, убачыўшы мяне, ледзьве не страціла прытомнасць. Пасля казала:

— Падумала: цябе ваўкі рвалі.

А бацька доўга расказваў леснікам пра маё «катанне на розе», як пра вясёлую прыгоду, і тыя смяяліся.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму бацька вырашыў больш не наймаць чужых пастухоў і загадзя папярэдзіў пра гэта свайго сына? Прачытайце адпаведныя радкі з твора.
2. Як сын аднёсся да слоў бацькі? Як гэта характарызуе яго? Адказ падмацуйце радкамі з твора.
3. Патлумачце сэнс выразаў: «хопіць гойсаць», «горкае дзіця», «працерабіць прасе́ку», «чмякнуцца на зямлю».
4. Пералічыце абавязкі пастуха. Ці лёгкая гэта праца? Чаму?
5. Што за прыгода здарылася з пастушком на пашы? Раскажыце.
6. Якая асноўная думка закладзена Іванам Шамякіным у гэтым апавяданні?
7. Разгледзьце ілюстрацыю на с. 19. У што апрануты пастушок? Абмяркуйце, якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да твора. Вусна апішыце іх.
8. Падрыхтуйце пераказ эпізода «Выпадак на пашы» ад асобы пастушка па плане:
   1. Небалючы ўдар.
   2. На розе Майкі.
   3. У гушчары.
   4. Пасля падзення.
   5. Дома.

**Давайце абмяркуем.** Дзякуючы каму фарміраваліся цярпенне і вытрымка ў галоўнага героя апавядання?



Правообладатель Национальный институт образования



# КАЛЫХАНКІ

* * *

Ходзіць коцік па палях,
Носіць сон у кашалях.
Ходзіць коцік па капусце,
Носіць сон у белай хусце.
Бабка коціка дагнала,
Сон для дзетачак забрала.
А ты, коця, вон, вон,
А на дзетак — сон, сон.

* * *



Баю-баінку-баю,[1]
Не лажыся на краю.

Не лажыся на краёк,
Прыйдзе шэранькі ваўчок.

Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Ён ухопіць за бачок.

А ён ухопіць за бачок
І зацягне ў лясок...

**1.** Хто звычайна выконваў калыханкі і для чаго? Як гэтыя песні характарызуюць саміх спявачак?
**2.** Чаму ў песнях-калыханках ужываюцца ласкавыя словы? Назавіце гэтыя словы.

---

[1] Кожны першы радок паўтараецца двойчы.



Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Андрэя Шышкіна «Калыханка».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Каго вы бачыце на карціне?

2) Па чым вы здагадаліся, што гэта жанчына-маці?

3) Чаму, на вашу думку, мастак намаляваў на каленях жанчыны кацяня?

4) Які час сутак адлюстраваны на палатне? Дакажыце.

5) Што за прадметы знаходзяцца каля акна? Для чаго выкарыстоўвалі людзі пра́сніцу?

6) Які настрой выклікала ў вас карціна Андрэя Шышкіна «Калыханка»? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

***Забаўля́нкі-паце́шкі*** — гэта невялікія вершы, якімі матулі ці бабулі звычайна супакойвалі або цешылі малых дзяцей.

## ЗАБАЎЛЯНКІ-ПАЦЕШКІ

* * *

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Зачапілася за пень,
Прастаяла цэлы дзень.

### Ягорачка

Горкай, горкай, горачкай
Ішоў малы Ягорачка.
Ваўкоў не баяўся,
Стра́хаў не пужаўся.
Вы́разаў Ягорачка
Дудачку-свісцёлачку,
І свістаў ён птушачкай,
Птушачкай-пяюшачкай.





Правообладатель Национальный институт образования

**ГЕНАДЗЬ АЎЛАСЕНКА**



## Чыя мама лепшая?

Адвячоркам мы гулялі
І аб мамах размаўлялі…
— У мяне, — прамовіў Пеця, —
Мама — лепшая на свеце!
Усміхнуўся Толя: — Не!
Мама лепшая ў мяне!
— У мяне! — сказала Поля. —
Бо яна працуе ў школе!
— Ну, дык што з таго, што ў школе! —
Запярэчыў Полі Коля. —
А мая — кіруе крамай!
— А мая працуе… мамай,
І цяпер з сястрычкай дома… —
Прашаптала ціха Тома.
— А мая, — сказала Ната, —
І за маму, і за тату!
Пэўна ж, мамачка мая
Лепей вашых удвая!

Не згадзіўся з гэтым Пеця…
Пачалі спрачацца дзеці:
Коля — з Поляй,
Пеця — з Натай…
Ну а я
Пайшоў дахаты.



Правообладатель Национальный институт образования



З імі я не стаў спрачацца.
І без спрэчкі ведаў я:
Калі шчыра разабрацца,
Мама лепшая — мая!



1. Пра каго дзеці вялі размову? Чаму яны спрачаліся?
2. Якімі фактамі кожны з дзяцей даводзіў важнасць сваіх мам? Прачытайце адпаведныя словы.
3. Як вы разумееце думку, выказаную ў апошнім чатырохрадкоўі верша? Ці згодны вы з ёй? Чаму?
4. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования

**Давайце абмяркуем.** Уявіце, што падобная спрэчка, як і ў герояў верша, адбылася паміж вашымі сябрамі. Як вы спыніце такую гаворку і якімі словамі супакоіце сяброў?

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. Пазнайце герояў твораў па апісаннях. З якіх яны твораў?

а) «Дзед зачарпнуў поўную лыжку капусты... Усе заўважылі, што і ў дзеда, як і ў Янкі, пачырванелі вочы, нібы ў іх нехта запаліў агеньчыкі. Мы з напружаннем чакалі, чым закончыцца гэты незвычайны паядынак...»;

б) «Жыў у аднаго чалавека сын. Вялікі ўжо вырас, а ніколі бацьку бацькам не называў»;

в) «І я бадай палюбіў сваё пастухоўства. Адзіноцтва палюбіў. І кароў, цёлак, бычкоў палюбіў. Яны зрабіліся маімі сябрамі».

2. У якім творы гэтага раздзела:

а) казачнік асуджае такую адмоўную рысу характару людзей, як зайздрасць;

б) казачнік павучае слухацца і паважаць сваіх бацькоў;

в) паэт сцвярджае, што для кожнага дзіцяці яго мама лепшая.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Разгледзьце ілюстрацыі. Пазнайце дзейных асоб, якія адлюстраваны. З якіх яны твораў?







4. Вызначце дзейных асоб у казках «Недалікатны сын» і «Зайздросны дзядзька», у апавяданнях «Лыжкай па лбе» Івана Муравейкі і «Пастух» Івана Шамякіна.

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Якія творы з гэтага раздзела вам найбольш спадабаліся? Чаму?

2. Пры чытанні якіх вершаў, апавяданняў вам было і смешна, і радасна? Чаму?

3. Чаму патрэбна з павагай і любоўю адносіцца да сваіх родзічаў?



Правообладатель Национальный институт образования

# ВЯСЕННІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ



**Мы пазнаёмімся** з новымі творамі пра абуджэнне і прыгажосць прыроды вясной, веснавыя змены ў прыродзе, пра адпачынак людзей у гэты час, захаванне нацыянальных традыцый і вясновых свят.

**Мы працягнем вучыцца:**

✓ знаходзіць у паэтычных творах вобразныя словы і выразы;

✓ выказваць уласныя адносіны да персанажаў і зместу твораў;

✓ знаходзіць у вершах і апавяданнях гэтага раздзела апісанне карцін вясенняй прыроды;

✓ чытаць выразна вершы, перадаваць адпаведны настрой з дапамогай інтанацыі.

**Варта задумацца.** Якія вясновыя вобразы пісьменнікі найчасцей апісваюць у сваіх творах? Чаму неабходна захоўваць нацыянальныя традыцыі?



Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Ранняя вясна».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Па чым вы здагадаліся, што на карціне адлюстравана вясна?

2) Што намалявана на пярэднім плане? На сярэднім? На дальнім?

3) Як выглядаюць на карціне снег, вада, дрэвы, хаты і неба? Апішыце іх.

4) Якіх фарбаў мастак выкарыстаў больш? Чаму?

5) Падзяліцеся ўражаннямі ад прагляду гэтага твора жывапісу.



Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** У скорагаворцы правільна вымаўляйце гукі [ч] і [ц’].

## СКОРАГАВОРКА

**Ч**акала **ч**айка **ч**аянят.
Ру**ч**ай **ч**акаў ру**ч**аянят.
**Ч**акалі **ч**аяняты,
Пакуль ру**ч**аяняты
Памыю**ць** ру**ч**аняты.
*Рыгор Барадулін.*

***Вы́прастаць*** — тут: супакоіць; зняць цяжар з душы.

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ



## Перад паводкай

Праясняецца пагода,
Бо вярнулася вясна.
Усё чакаеш, што прырода
Ўстрапянецца ада сна.

І пад птушы крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадыме бацька Нёман
На хрыбце магутным лёд.


Правообладатель Национальный институт образования



Зазвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Снег, размоклы ў час адлігі,
Змые з луга без сляда.

Дык разлійся ж раздольна
Ў чыстым полі і гаю
І красой паводкі вольнай
Душу выпрастай маю!

1. Якія прыкметы ўказваюць на ранннюю вясну? Знайдзіце і прачытайце адпаведныя радкі.
2. Што вы ўяўлялі ў час чытання? Вусна апішыце карціны вясны.
3. Растлумачце сэнс выразаў «на хрыбце магутным» і «зазвіняць жалобна крыгі».
4. Якія словы і выразы дапамагаюць уявіць вясну жывой, як чалавека? Знайдзіце і прачытайце іх.
5. Да каго і з якой просьбай Максім Багдановіч звяртаецца ў апошнім чатырохрадкоўі?
6. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Алега Малчанава «Вясновая ўсмешка».



Правообладатель Национальный институт образования



7. Ці падобныя верш «Перад паводкай» і карціна «Вясновая ўсмешка» па настроі? Якімі радкамі з верша Максіма Багдановіча можна падпісаць карціну? Чаму вы так думаеце?
8. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Ці падабаецца вам вясна? Чаму?

## АДАМ РУСАК

## Мама

Палячу я пчолкай
На лугі, палеткі,
Назбіраю маме
Мёду з кожнай кветкі.

Выйду ў лес птушыны,
Песень назбіраю,



Правообладатель Национальный институт образования



Пра вясну і радасць
Маме заспяваю.

Супыню над лесам
Хмару-навальніцу,
Хай уночы маме
Светлы сон прысніцца.

Ды дарункаў гэтых,
Пэўна, будзе мала,
Каб табе аддзячыць
За твой клопат, мама.



1. Якія пачуцці і думкі выклікаў у вас гэты верш?
2. Па чым можна меркаваць, што герой твора з'яўляецца фантазёрам? Падмацуйце свае думкі адпаведнымі радкамі з твора.
3. Што натхняе сына на неверагодныя ўчынкі?
4. Чаму герой верша лічыць, што дарункаў маме ўсё роўна будзе мала?
5. Разгледзьце малюнак. Паразважайце, ці ўдалося мастаку перадаць настрой і змест верша. Свае думкі падмацуйце адпаведнымі радкамі з твора.
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша з адпаведным настроем і інтанацыяй. (Глядзіце форзац 1.)

**Давайце абмяркуем.** Раскажыце, як вы віншуеце сваіх мам са святам.



Правообладатель Национальный институт образования

# ВЯСНОВЫЯ ПЕСНІ

***Маладзі́ца*** — маладая замужняя жанчына.
***Чапе́ц*** — лёгкі галаўны ўбор у выглядзе шапачкі, завязанай пад барадой, які раней насілі замужнія жанчыны.

## Вясна красна, адкуль прыйшла...

— Вясна красна́, адкуль прыйшла,
Адкуль прыйшла, што прынясла?
— Прынясла я цёплае лецейка:
Малым дзеткам — па яечку,
Стары́м бабкам — па кіёчку,
Красным дзеўкам — па вяночку,
Маладзіцам — па сярпочку.
Стары́я бабкі — чапцы́ шыці,
Кра́сны дзеўкі — вянкі ві́ці,
Маладзіцы — жыта жаці.
Красны дзеўкі — на вулічку,
Маладзіцы — за люлечку,
Красны дзеўкі — гулі, гулі,
Маладзіцы — люлі, люлі.

1. Якія мары і спадзяванні ўскладваў народ на прыход вясны?
2. Як у народнай песні выказваюцца адносіны да дзяцінства і старасці? Як гэта характарызуе беларусаў?
3. Прачытайце песню па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования

***Я́рая*** (пчолка) — гнеўная, раз’юшаная.
***Ляло́*** — тое, што і люлі-люлі.



## Ты, пчолачка ярая

Ты, пчолачка ярая,
Ты вылецць за мора,
Ой, ляло, ляло,
Ты вылецць за мора.

Ты вынесі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Ой, ляло, ляло,
Ключыкі залатыя.

Адамкні лецечка,
Лета цёплае,
Ой, ляло, ляло,
Лета цёплае.

Замкні зіманьку,
Зіму сцюдзёную,
Ой, ляло, ляло,
Зіму сцюдзёную.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Якія мары выказаны ў гэтай песні?
2. Што можна сказаць пра чалавека, які жыве такімі надзеямі?
3. Якія ласкавыя словы ўжываюцца ў вясновай песні? Знайдзіце і прачытайце іх.
4. Разгледзьце ілюстрацыю да песні. Якія прыкметы сведчаць пра раннюю вясну? Назавіце іх.
5. З якой інтанацыяй варта чытаць словы гэтай песні? Чаму? Як вядома, вяснянкі ў большасці выконваліся наступным чынам: адзін удзельнік гурту спяваў першыя два радкі, а трэці і чацвёрты радкі спевакі выконвалі хорам. Выразна прачытайце і вы гэту песню так.

**Давайце абмяркуем.** Ці даводзілася вам бываць у вясеннім лесе? Раскажыце, што цікавага вы бачылі ў ім.

***Пе́кны*** — прыгожы.
***Каламу́тны*** — му́тны, непразрысты.
***Ціку́е*** — тут: цячэ ў выбраным напрамку.
***Хляве́ц*** — памяшканне для свойскай жывёлы, птушак.
***Паро́г*** — тут: перашкода, якая затрымлівае ход вады.
***Перава́л*** — тут: найбольш нізкае месца на полі, даступнае для пераходу вады.
***Мардава́цца*** — выбівацца з сіл.
***Пакрысе́*** — паступова, не адразу.



Правообладатель Национальный институт образования

## Вясна

Які пекны, слаўны дзянёк! Выйдзем, дзеткі, на вуліцу, на божы свет. Паглядзім, паслухаем. Можа, чаго і навучыць нас гэты божы свет?

Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказвацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць. Выходзіць з хаты гаспадар. Бачыць: вада цікуе на яго хлявец. Не, галубка! Не чапай будовы. Там стаіць авечачка, кароўка. Ідзі сабе далей. І гаспадар бярэ рыдлёўку і пракопвае ёй дарогу. А воданька закаламу́ціцца яшчэ больш і пабяжыць далей. Па дарозе сустракае яна другі гэтакі самы равок. Сустрэнуцца, забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам. Іх сустрэне зноў новы равок, а там, пазіраеш, прыстане і чацвёрты, і пяты. І ўсе яны зліваюцца: разам і весялей, і лягчэй ваяваць з тымі парогамі, якія загараджаюць ім дарогу. І нікога яны не крыўдзяць. Сустрэнуць малюсенькі равочак, такі малюсенькі, што цячэ ён, як слёзка, па капельцы. Марду́ецца, бедны, працуе над кусочкам лёду, што загарадзіў яму сцежачку. Збірае ўсе сілы і з вялікім трудом ледзьве-ледзьве скоціць нягодны



Правообладатель Национальный институт образования



кусочак лёду і з такою гэта радасцю зліваецца з пераваламǃ А перавал ахвотней бярэ з сабою і яго працу. І вось пакрысе́, памаленьку перавал пераходзіць ужо ў рэчку. Шуміць, раве ў полі. Ён так ужо акрэп, што можа пакаціць і камень.

Бачыце, дзеткі, як расце сіла вады.

*Паводле Якуба Коласа.*



1. Якую веснавую з'яву прыроды апісвае Якуб Колас у творы?
2. З якой мэтай пісьменнік ужывае ў творы ласкавыя словы? Знайдзіце і прачытайце іх.
3. З дапамогай якіх слоў і выразаў аўтар ажыўляе вясну? Прачытайце іх.
4. Чаму Якуб Колас запрашае дзяцей паглядзець, як вада набірае сілу? На што скіроўвае ён увагу малога чытача?



Правообладатель Национальный институт образования

5. Якая асноўная думка гэтага апавядання?
6. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віктара Каралёва «Вясна прыйшла». Якія радкі з апавядання Якуба Коласа найбольш сугучныя з гэтым творам жывапісу? Прачытайце.



7. Падрыхтуйце выразнае чытанне апавядання.

**Давайце абмяркуем.** Ці даводзілася вам назіраць за вясновымі з'явамі? Што цікавага і незвычайнага вы назіралі? Раскажыце.

## Загадка

Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць.



Правообладатель Национальный институт образования

## УЛАДЗІМІР КАРЫЗНА



### Лісце прыляцела

Раненька,
На зорцы, на зары
Прыляцелі
Цёплыя вятры.

Сонца на блакіт снягоў
Прынеслі —
Зазвінелі ручайкі,
Як песні.

Прыляцелі жаўранкі
Здалёк,
Кожны галасок —
Нібы званок.

І шпакі за імі
Прыбылі,
Свіст парассыпалі
На палі.





Правообладатель Национальный институт образования



Вось і лісцікі
Нарэшце прыляцелі,
Дружна
На галінках дрэў
Паселі,

Птушак слухаюць,
Паветра п'юць
І, здаецца,
Зараз запяюць.

1. Якім настроем прасякнуты верш? Патлумачце.
2. Па якіх прыкметах можна здагадацца, што верш пра вясну?
3. З чым паэт параўноўвае ручайкі? Голас жаўранкаў? Прачытайце адпаведныя радкі.
4. Чаму сярод іншых прыкмет аўтар больш увагі надае з'яўленню лісточкаў? Каго яны вам нагадалі?
5. Якія словы дапамаглі Уладзіміру Карызне «ажывіць» лісцікі, паказаць іх падобнымі на птушак?
6. Знайдзіце ў вершы словы, што рыфмуюцца. Прачытайце іх парамі.
7. Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш. Выразна вымаўляйце гукі [г], [р], [ч], [ў] і [ц’].

## Пралеска



Прыгрэла сонейка.
На ўзлеску
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць і слухае пралеска,
Як ціха дыхае зямля.

*Авяр’ян Дзержынскі.*

***Зіхо́тны, зіхатлі́вы*** — якія бліскаюць, ззяе яркім, пералівістым святлом.
***Гамана́ (разм.)*** — бязладны шум ад мноства галасоў, гукаў.
***Шы́біна*** — тое, што і шы́ба.

## МІКОЛА МЯТЛІЦКІ

## Пытанні

Спытала Ганулька ў кветак і траў:
— Скажыце, хто луг так прыгожа прыбраў?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў шумных палёў:
— Хто фарбы такое пяшчоты знайшоў?



Правообладатель Национальный институт образования

І чуе ў адказ зноў такое яна:
— Палямі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў зіхотнай ракі:
— Сінечу на хвалі праліў хто такі?
Ёй шэпча ў адказ лёгкіх хваль гамана:
— Хадзіла ўзбярэжжам Красуня-Вясна!

А сонечны зайчык на шыбіну — скок.
Кульнуўся свавольна ён, слепячы зрок.
І жмурыцца Ганна:
— Ды гэта ж яна,
Смяецца і скача, Красуня-Вясна!

1. У каго цікавілася Ганулька пра вясновую прыгажосць? Пералічыце дзейных асоб у вершы.
2. Што чула дзяўчынка ў адказ на сваё запытанне?
3. Патлумачце сэнс радка «А сонечны зайчык на шыбіну — скок».
4. Як характарызуе саму Ганульку яе размова з кветкамі, травамі, вятрамі, палямі, ракой?
5. Дзякуючы каму дзяўчынка здагадалася пра надыход вясны? Чаму менавіта сонечны зайчык паслужыў ёй падказкай?
6. Чым верш Міколы Мятліцкага «Пытанні» падобны да народнай песні?
7. Які настрой стварае гэты твор? Прачытайце верш выразна, перадаючы вясенні настрой паэта.


Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Генрыха Вейсенгофа «Вясна».



Якія пытанні Ганульκі можна задаць да гэтага твора жывапісу? Прачытайце іх.



Размяркуйце ролі ў вершы. Прачытайце яго па ролях.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. У якіх творах даецца такое апісанне вясновай прыроды?

а) Зазвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Снег, размоклы ў час адлігі,
Змые з лугу без сляда;



Правообладатель Национальный институт образования

б) «Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказвацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць».

2. Да якіх твораў зроблены гэтыя малюнкі? Назавіце аўтараў гэтых твораў.





3. Адгадайце, пра каго ці пра што гаворыцца ў наступных радках.

а) Вось і ...
Нарэшце прыляцелі,
Дружна
На галінках дрэў
Паселі,

Птушак слухаюць,
Паветра п'юць
І, здаецца,
Зараз запяюць;



Правообладатель Национальный институт образования

б) «Сустрэнуцца, забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам. Іх сустрэне зноў новы равок, а там, пазіраеш, прыстане і чацвёрты, і пяты. І ўсе яны зліваюцца: разам і весялей, і лягчэй ваяваць з тымі парогамі, якія загараджаюць ім дарогу».

## *Разумею, магу растлумачыць...*

1. Чаму людзям падабаецца вясна?
2. Якія вершы і апавяданні з гэтага раздзела спадабаліся вам? Чаму?
3. З якой мэтай пісьменнікі ў сваіх творах ужываюць вобразныя словы і выразы?
4. Устаўце прапушчаныя словы ў паэтычныя радкі:

а) Спытала Ганулька ў кветак і траў:
— Скажыце, хто луг так прыгожа ...?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла ... ...!

б) Раненька,
На зорцы, на ...
Прыляцелі
Цёплыя ... .
Сонца на блакіт ...
Прынеслі —
Зазвінелі ...,
Як песні.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Разгледзьце малюнкі. Складзіце апавяданне. Дайце яму загаловак.






*Апорныя словазлучэнні і сказы:* з боку лесу, на адной з крыг, спалоханае медзведзяня, Максімка не разгубіўся, бацька чысціў ад снегу сцяжынку, было небяспечна, хуткае цячэнне, лодку кідала ў розныя бакі́, зачапіў багром, пасадзіў малое ў лодку, на супрацьлеглы бераг, высадзіў медзведзяня, аблізвала языком, як бы дзякавала чалавеку, Максімка ганарыўся сваім татам.

6. Чаму Максімка ганарыўся сваім бацькам? Выкажыце свае думкі.



Правообладатель Национальный институт образования

# ХТО ХОЧА ШЧАСЛІВА ЖЫЦЬ, ТОЙ ПРАЦУ ПАВІНЕН ЛЮБІЦЬ



**Мы пазнаёмімся** з новымі творамі на тэму працы і адносін да працавітых людзей розных прафесій, вызначым ролю прафесіі ў жыцці чалавека.

**Мы працягнем вучыцца:**

- ✓ тлумачыць учынкі дзейных асоб, выказваць свае адносіны да іх;
- ✓ разумець, у чым заключаецца асноўная думка прачытаных твораў;
- ✓ падрабязна пераказваць змест прачытаных апавяданняў;
- ✓ выразна чытаць вершы з гэтага раздзела, перадаваць іх настрой.

**Варта задумацца.** Якую ролю ў жыцці людзей выконвае праца?



Правообладатель Национальный институт образования

*(Пачне)* ***налівáць*** *(зярняты)* — напаўняцца чым-небудзь вадкім, сакавітым.
***Сноп*** — звязка зжатых сцёблаў збажыны з каласамі.
***Бáбка*** — дзесяць снапоў збожжа, састаўленых разам для прасушвання і накрытых распасцёртым снапом.
***Дзяжá*** — драўляная пасудзіна, у якой рашчынялі хлеб.
***Паты́ліца*** — задняя частка галавы.
***Мару́дны*** — павольны, няспешны.
***Вы́ган*** — месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла.
***Лагчы́на*** — нізкае месца сярод схілаў, нізіна.

## Лёгкі хлеб

*Беларуская народная казка*

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

— Ты што ясі, чадавеча?

— Хлеб, — адказвае касец.

— А смачны ён?



Правообладатель Национальный институт образования

— Дзіва што смачны!

— Дай мне пакаштаваць.

— Калі ласка!

Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку. Спадабаўся ваўку хлеб. Ён і кажа:

— Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці, але дзе яго даставаць? Пара́й, чалавеча!

— Добра, — кажа касец, — навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць!

І пачаў ён вучыць ваўка:

— Перш-наперш трэба зямлю ўзара́ць...

— Тады і хлеб будзе?

— Не, браце, пачакай. Потым трэба забаранава́ць...

— І можна хлеб есці? — замахаў воўк хвастом.





Правообладатель Национальный институт образования

— Што ты, пачакай яшчэ. Раней трэба жыта пасеяць...

— Тады будзе хлеб? — аблізнуўся воўк.

— Не яшчэ. Дачакайся, пакуль жыта ўзы́дзе, халодную зіму перазімуе, вясной вырасце, потым закрасу́е, потым пачне наліваць зярняты, потым спець...

— Ох, — уздыхнуў воўк, — вельмі ж доўга чакаць. Але цяпер-то ўжо я наемся хлеба ўволю!

— Дзе там наясіся! — перапыняе касец. — Рана яшчэ. Спачатку спелае жыта трэба зжаць, потым у снапы звязаць, снапы ў бабкі паставіць. Вецер іх правее, сонейка прасушыць, тады вязі іх на ток...

— І есці хлеб буду?

— Які нецярплівы! Спачатку трэба снапы абмалаціць, зярняты ў мяшкі сабраць, мяшкі ў млын завезці ды мукі намалоць...

— І ўсё?

— Не, не ўсё. Муку трэба замясіць у дзяжы́ і чакаць, пакуль цеста пады́дзе. Тады ў гарачую печ пасадзіць.

— І спячэцца хлеб?

— Але, спячэцца хлеб. Вось тады і наясіся яго, — скончыў касец навуку.

Задумаўся воўк, потым пачухаў лапай патыліцу і кажа:



Правообладатель Национальный институт образования

— Не! Гэта работа занадта марудная і ця́жкая. Лепш парай мне, чалавеча, як лягчэй ежу здабываць.

— Ну што ж, — кажа касец, — калі не хочаш ця́жкі хлеб есці, параю табе лёгкі. Ідзі на вы́ган, там конь пасецца.

Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня:

— Конь, конь! Я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа конь, — еш. Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.

— І то праўда, — згадзіўся воўк.

Нагнуўся ён падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы...

Перакуліўся воўк ды ходу.

Прыбег да рэчкі. Бачыць — на беразе гусі пасуцца. «Ці не з'есці мне іх?» — думае. Потым і кажа:

— Гусі, гусі! Я вас з'ем.

— Што ж, — адказваюць гусі, — еш. Але спачатку зрабі нам адну паслу́гу перад смерцю.

— Якую? — пытаецца воўк.

— Паспявай нам, а мы паслухаем.

— Гэта можна. Спяваць я мастак.

Сеў воўк на купіну, задраў галаву і давай выць. А гусі крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.



Правообладатель Национальный институт образования



Злез воўк з купіны, правёў гусей вачамі і пайшоў далей ні з чым.

Ідзе ды лае сябе апошнімі словамі: «Ці ж не дурань я, га? Навошта я згадзіўся спяваць гусям? Ну, цяпер, каго ні сустрэну — з'ем!»

Толькі ён так падумаў, бачыць — на полі чарада авечак пасецца, а пастух спіць. Нагле́дзеў воўк у чарадзе самага большага барана, схапіў яго і кажа:

— Баран, баран, я цябе з'ем.

— Што ж, — кажа баран, — такая мая доля. Але каб не мучыцца мне доўга, ды і табе каб не ламаць зубы аб мае стары́я косці, стань лепш вунь у той лагчы́нцы і разяў рот, а я ўзбягу на ўзгорак, разганюся і сам ускочу табе ў рот.

— Дзякуй за параду, — сказаў воўк.



Правообладатель Национальный институт образования

Стаў ён у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды — бух! — рагамі ваўка ў галаву. Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка.

Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае:

— Цікава: з'еў я яго ці не?

А тым часам касец скончыў работу і ідзе дахаты.

Пачуў ён ваўковы словы і кажа:

— З'есці не з'еў, але паспытаў лёгкага хлеба.

1. Чаму, на вашу думку, у касца было што паесці, а воўк быў галодны?
2. Як вы лічыце, што дапамагло касцу стаць такім мудрым, цярплівым і практычным чалавекам?
3. Ці спадабалася ваўку навука касца? Чаму?
4. Чаму касец на развітанне накіраваў ваўка да каня?
5. Паразважайце, чаму гусі, баран змаглі ўратавацца ад бяды. Ці ўдалося ваўку пакаштаваць «лёгкага хлеба»?
6. Як вы разумееце сэнс выразаў: «пачухаў лапай патыліцу», «іскры пасыпаліся з вачэй» і «ачухаўся воўк»?
7. Разгледзьце ілюстрацыі да казкі (с. 51, 54). Да якіх эпізодаў твора яны зроблены?
8. Прачытайце казку па асобах.
9. Якія з прыказак тлумачаць сэнс казкі?



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРЫКАЗКІ

- Без працы няма чаго хлеба шукаці.
- Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
- На языку — хоць куды́, а на працы — ніку́ды.
- Дзе шчырая праца — там густа, а дзе лянота — там пуста.

**Давайце абмяркуем.** Растлумачце, што значыць *лёгкі хлеб, цяжкі хлеб.*

### У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Алены Флёравай «Бацька і сын».





Правообладатель Национальный институт образования

**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Чаму мастачка дала карціне такую назву?

2) Дзе знаходзяцца бацька і сын? Па чым вы здагадаліся?

3) У які час сутак адбываецца касьба? Якія прыкметы сведчаць пра гэта? Чаму так думаеце?

4) Як выглядаюць бацькавы рукі? Пра што сведчыць іх выгляд? Чаму мастак паказала бацькавы рукі на пярэднім плане?

5) З ахвотай хлопчык вучыцца касіць ці без усякага жадання? Па чым вы мяркуеце?

6) Чаму бацька траціць свой час на вучобу малога сына?

7) Хто адлюстраваны на заднім плане? Чым яны заняты?

8) Як аўтар карціны адносіцца да сваіх герояў? Чаму вы так думаеце?

---

**Маўленчая размінка.** Правільна вымаўляйце гукі [г], [ў], [ц’] у час чытання ўрыўка з верша.

### Ганаруся

Будаўнік, мантажнік, слесар,
Вас я рад заўжды вітаць.
Многа розных ёсць прафесій,
Трэба мне адну абраць...

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

# Буду настаўнікам

З беларускай шчырай мовай
Ладзяць нашы галасы.
Эх, пяюцца самі словы:
— Бусел,
верасень,
лясы!



З Вольгай Паўлаўнай цікава.
Не злуецца, не крычыць.
Мы, як быццам для забавы,
Разам вучымся лічыць.

А бяжым на перапынак,
Чуюць хлопчыкі наказ:
— Паважайце вы дзяўчынак —
Будуць паважаць і вас!

Падрасту і ўсё згада́ю,
Вашых слоў мне не забыць:
— Дзеці, кожнаму жадаю
Чалавекам добрым быць!

У няшчасці друг далёкі,
Трапіў у бяду сусед, —
Не глядзі спакойна збоку,
Памажы яму як след!



Правообладатель Национальный институт образования



Адкрывае школа цуды
Мне і ўсім маім сябрам.
Калі-небудзь, можа, буду
Я настаўнікам і сам.

1. Дзякуючы каму дзеці палюбілі беларускую мову?
2. Як вы разумееце сэнс радкоў:

   З беларускай шчырай мовай
   Ладзяць нашы галасы?

3. Што кажа вучань пра характар сваёй настаўніцы Вольгі Паўлаўны? Прачытайце адпаведныя радкі.
4. Якія словы настаўніцы запомніў аўтар на ўсё сваё жыццё? Знайдзіце і прачытайце гэтыя словы. Ці спадабаліся яны вам? Чаму?
5. Якія ілюстрацыі можна зрабіць да верша? Апішыце іх словамі.
6. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрываюць школа і настаўнікі? Ці лёгка, на вашу думку, быць настаўнікам? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

***Му́ляр*** — рабочы, які будуе што-небудзь з каменю або цэглы.
***Мурава́ны*** — зроблены з каменю або цэглы.
***Рыштава́нне*** — часовае збудаванне з дошак, стоек або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен будынка для правядзення будаўнічых або рамонтных работ.

## ІВАН МУРАВЕЙКА

## Паўлік-будаўнік

Паўлікаў тата — будаўнік. Працуе мулярам — складае з цэглы будынкі. Амаль палавіна дамоў у іх вёсцы — мураваныя, і ўсе пабудаваў Паўлікаў тата са сваімі таварышамі.

Аднойчы тата сказаў Паўліку:

— Ты ўжо скончыў дзіцячы садзік і паступіў у школу, у першы клас. Калі станеш зусім-зусім дарослым, кім ты будзеш?

— Буду, як ты, будаўніком, — адразу ж адказаў Паўлік, бо гэта ён даўно ўжо вырашыў.

— Добра, — падтрымаў сыночка тата, — наша прафесія самая патрэбная на зямлі. Мая брыгада пачала будаваць новы магазін. Ты хацеў бы нам дапамагчы?

— Яшчэ як хацеў бы! — узрадаваўся Паўлік. — Але ж я нічога не ўмею.



Правообладатель Национальный институт образования

— Я цябе навучу...

Паўлік здагадаўся, што тата хоча ўзяць яго з сабой на будоўлю, і, каб ён не перадумаў, сказаў:

— Дык хадзем хутчэй.

На будоўлі Паўліка сустрэлі весела:

— У нашу брыгаду прыбыло папаўненне. Цяпер мы хутка закончым будаўніцтва.

Тата дапамог сыну ўзысці на рыштаванні, і яны пачалі працаваць.

— Бяры цагліну, — сказаў тата.

Паўлік узяў.

— Кладзі сюды на раствор.

І яшчэ адну цагліну паклаў Паўлік.

— А цяпер, сынок, бяжы дахаты, — сказаў тата. — Як закончыш першы клас — пакладзеш чатыры цагліны, другі клас — восем цаглін, трэці — шаснаццаць, чацвёрты — трыццаць дзве...





Правообладатель Национальный институт образования

— А як скончу школу, колькі цаглін я за дзень буду класці? — запытаў Паўлік.

— Тады ты будзеш сапраўдным будаўніком і пакладзеш столькі цаглін, колькі я цяпер кладу.

Паўлік злез з рыштаванняў і доўга глядзеў, як працуе яго тата.

Неяк, калі першакласнікі праходзілі ля будучага магазіна, Паўлік паказаў рукой на сярэдзіну сцяны:

— Вунь тыя дзве цагліны — мае!



1. Кім працаваў Паўлікаў тата? Што вы ўжо ведаеце пра гэту прафесію?
2. На якую тэму тата аднойчы гутарыў з сынам? Як гэта характарызуе бацьку?
3. З якой мэтай тата вырашыў запрасіць сына з сабой на працу?
4. Паразважайце, кім у будучым можа стаць Паўлік.
5. Які эпізод з апавядання праілюстраваны на с. 61? Прачытайце ўрывак, якому адпавядае малюнак.



Размяркуйце ролі і прачытайце апавяданне па асобах.

**Давайце абмяркуем.** Чаму прафесія будаўніка лічыцца адной з самых патрэбных на зямлі?



Правообладатель Национальный институт образования

***Пакруча́стыя касмылі́ по́ўсці*** *(разм.)* — скудлачаныя пасмы валасоў.
***Вало́к*** — доўгая града́ згрэбенага сена.
***Валкава́ць*** — зграбаць сухую скошаную траву ў валкі́.
***Перайна́чыць*** — змяніць, зрабіць іншым.

**МІХАСЬ ДАНІЛЕНКА**

## Маленькі фермер



Вёска Росіца невялікая — усяго дванаццаць двароў. Сюды Максімкавы бацькі́ пераехалі з горада. Тата адрамантаваў даўжэзны цялятнік: перакрыў лістамі шыферу, зрабіў новыя за́гарадкі, паілкі для цялят. Пад паве́ць паставіў трактар з прычэпам. Калі ўсё было зроблена, ён задаволена паляпаў Максімку па плячы.

— Будзеш нашым памочнікам, — сказаў бацька. — Заўтра прыгонім з Сяргеем бычкоў.

Сяргей — старэйшы Максімкаў брат. Ён ужо перайшоў у восьмы клас. Раней у горадзе школа была побач. Цяпер жа трэба хадзіць кіламетраў за восем. Побач са школай ёсць вялікая ферма, адкуль раніцай прыгналі бычкоў — пярэсценькіх,



Правообладатель Национальный институт образования

з пакручастымі касмылямі поўсці над шырокімі лбамі.

І пабеглі, закруціліся ў бясконцай працы дні. Бацька наладжваў электрапастуха: на ўкапа́ныя слупы нацягваў дрот — агароджваў участак, дзе пасвіліся бычкі. А яшчэ трэба было касіць траву, чысціць летні загон, вазіць тарфакрошку на подсціл. Добра, што Сяргей дапамагаў бацькам. Ды і Максімка часта пакіда́ў свае караблікі на рачулцы і бег прыглядваць за бычкамі, каб не ўбіліся дзе ў канюшы́ну.

— Што б мы рабілі тут без цябе? — абдымала Максімку маці. — Наш ты маленькі фермер...

— А хто такі фермер, мама? — пацікавіўся Максімка.

— Гэта, сынок, гаспадар, — растлумачыла маці. — Ты ж дапамагаеш нам і бычкоў пасвіць,





Правообладатель Национальный институт образования

і сена валкаваць, і ваду ў карыты з кранаў пускаеш... Пачакай, вось прыедуць яшчэ з горада людзі, перайначыцца наша глухая Росіца. Зазвіняць вечарамі на вуліцах песні...

Хутчэй бы! Бо зараз позна вечарам толькі на верандзе Максімкавага дома гучала музыка. Гэта Сяргей уключыў радыёпрыёмнік. І не ва ўсіх хатах свяціліся вокны. Мусіць, чакалі, калі прыедуць новыя гаспадары.

1. Куды пераехалі Максімкавы бацькі́ з горада?
2. Хто такі фермер? Што вы даведаліся пра яго з апавядання? Ці лёгка быць фермерам? Сваю думку пацвердзіце словамі з твора.
3. Як вы разумееце сэнс выразу «бег прыглядаць за бычкамі, каб не ўбіліся дзе ў канюшыну»?
4. Якую пасільную дапамогу аказваў сям'і Максімка? Як гэта характарызуе хлопчыка?
5. Пра што марылі дзеці і дарослыя ў Максімкавай сям'і? Прачытайце.
6. Да якога эпізоду твора падыходзіць ілюстрацыя (с. 64)? Паразважайце, якія яшчэ можна зрабіць малюнкі да апавядання.

Падзяліце апавяданне на сэнсавыя часткі. Кожнай частцы дайце загаловак. Перакажыце змест твора па плане.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРЫКАЗКІ

- Праца чалавека трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе́.
- Усё, што ўмееш, тое добра.
- Хто працуе, той не сумуе.




***Кампо́ст*** — угнаенне, якое атрымліваецца ад змешвання розных адкідаў з зямлёй і торфам.
***Ток*** — спецыяльны будынак для складання, абмалоту і ачысткі збожжа.
***Зя́бліва*** — поле, узаранае з восені пад веснавую сяўбу.



### ЗМІТРОК МАРОЗАЎ

## Тата ў Ромы — аграном

Падышоў да таты Рома:
— Раскажы пра агранома. Што ён
робіць? Чым заняты?..
— Добра! — сыну кажа тата. —
На сяле — усім вядома —
Не пражыць без агранома.
Летам, восенню, вясной
І марознаю зімой
Дбае ён пра ўраджай...
Кажа Рома:



Правообладатель Национальный институт образования

— Пачакай!
Не расце зімой нічога,
Вецер вые ля парога,
Поле спіць глыбокім сном...
— Ды не дрэмле аграном, —
Зноў даводзіць сыну тата. —
Зранку вельмі я заняты.
Торф і гной на поле возім,
Каб радзіла бульба ўвосень.
А яшчэ кампост рыхтуем,
На таку ячмень сартуем,
Трэба скласці план сяўбы...
Словам, тут не да гульбы!
— А вясной, — пытае Рома, —
Колькі спраў у агранома?
Кажа тата:
— Не злічыць:
Трэба жыта падкарміць,
Поле хораша ўзараць,
Да сяўбы падрыхтаваць.





Правообладатель Национальный институт образования

А яшчэ павінен ён
Ведаць, дзе пасеяць лён,
Кукурузу і ячмень...
Корміць год вясновы дзень!

* * *

— Ну, а ўлетку, — кажа Рома, —
Мне самому ўсё вядома!
Трэба луг у час касіць,
Прапалоць і падкарміць
Буракі, капусту...
Дома
Не сустрэнеш агранома!
— І ў жніво, — даводзіць тата, —
На сяле турбот багата.
Хлебаробам не да сну,
Жнуць камбайны збажыну.
Дзень і ноч грукоча ток...
Трэба кожны каласок
Да зярнятка змалаціць...
Аграном за ўсім глядзіць!
— Ну, а восенню?
— Увосень
У мяне работ мо з восем!
Трэба
Бульбу дакапаць,
Луг на зябліва ўзараць,
Звезці лён, пасеяць жыта...



Правообладатель Национальный институт образования

— Зразумеў цяпер нібыта, —
Задумённа кажа Рома, —
Не растуць без агранома
Жыта, бульба, буракі,
Памідоры, агуркі...
Шмат прафесій у жыцці,
Толькі лепшай не знайсці!

1. З якімі пытаннямі звярнуўся да бацькі сын Рома?
2. Чаму хлопчык добра ведаў толькі летнія абавязкі свайго таты-агранома?
3. Якой працай заняты аграном зімой, вясной, летам і восенню? Прачытайце адпаведныя ўрыўкі з твора.
4. Растлумачце сэнс слоў бацькі: «Корміць год вясновы дзень!», «Увосень у мяне работ мо з восем!».
5. Якімі рысамі характару надзелены паэтам яго героі — тата і сын Рома? (Глядзіце форзац 2.)
6. Абмяркуйце, якія яшчэ ілюстрацыі можна намаляваць да верша.

**Давайце абмяркуем.** Чаму Рома лічыць, што лепшая прафесія ў жыцці — гэта прафесія агранома?

Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования

***Паспыта́ць*** — пакаштаваць, паспрабаваць на смак.
***Дако́р*** — папрок за што-небудзь.



**ІВАН АНОШКІН**

## Воля-кулінарка

У Волі сёння свята: ёй споўнілася дзевяць гадоў. Дзяўчынка чакала гасцей.

Пачастунак сябрам Волька збіралася прыгатаваць сама. Распытала ў бабулі, як спячы пірог, і ўзялася за работу. Яна рашчыніла цеста, усыпала цукру, ванілі, усялякіх спецый з бабульчыных бляшанак.

— Не забудзь, унучка, соды ўсыпаць, — падказала бабуля.

— А дзе яна, сода?

— Ды вунь, — занятая сваёй справай, кіўнула бабуля на шафу.

Волька спрытна ўзабралася на табурэтку, знайшла на шафе соду, шчодра сыпанула ў цеста.

Госці завіталі вясёлай гурбой, уручылі падарункі: хто кніжку з малюнкамі, хто каляровыя алоўкі, хто шаўковыя стужкі. Волька шчыра падзякавала сябрам за падарункі, пачала гасцей



Правообладатель Национальный институт образования

за стол запрашаць. Кубкі з чаем прынесла, пірог падала: частуйцеся, калі ласка!

— Сама пякла, — пахвалілася Волька, разразаючы нажом румяную скарынку пірага.

— Паспытаем, — Пятрусь першы адкусіў пірог. Адкусіў і чамусьці скрывіўся.

Нож выпаў з Вольчыных рук. «Чаму не падабаецца гэтаму Петрусю?» Узяла яна кавалачак пірага ў рот і... таксама зморшчылася. А бабуля, паспытаўшы, з дакорам паківала галавой.

— Колькі ж ты соды ўсыпала?

— Усю, што ў бляшанцы была, — праз слёзы адказала Волька. — Каб пірог быў смачнейшы...

— Эх ты, кулінарка! — пляснула далонямі бабуля. — Хапіла б чайнай лыжачкі...





Правообладатель Национальный институт образования

Яно, можа, і нядобра смяяцца з імянінніцы, але як тут утрымаешся. І госці смяяліся. А Волька, здавалася, вось-вось заплача.

— І не такое бывае, — суцяшала яе бабуля. — Горш, калі хто ні за што не бярэцца... Я вас, унучкі, сваім пячэннем пачастую...

Хлопчыкі і дзяўчынкі пілі чай з бабульчыным пячэннем, пасмейваліся. Але Волька больш не крыўдзілася на іх.

*Паводле І. Аношкіна.*

1. Якое свята адзначала Волька?
2. Чым вырашыла здзівіць дзяўчынка гасцей? Як гэта яе характарызуе?
3. Які недарэчны выпадак адбыўся за сталом падчас святкавання? Прачытайце.
4. Ці правільна паводзілі сябе госці? Раскажыце, як вы павялі б сябе ў падобнай сітуацыі.
5. Як бабуля суцешыла ўнучку? Прачытайце.
6. Як вы разумееце словы бабулі: «Горш, калі хто ні за што не бярэцца...»?
7. Чаму Волька больш не крыўдзілася на сяброў?
8. Разгледзьце ілюстрацыю на с. 71. Перакажыце ўрывак з апавядання, да якога яна адносіцца.

**Давайце абмяркуем.** Раскажыце, якія прафесіі ў вашых бацькоў, бабуль і дзядуль. Кім вы хацелі б стаць?



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Ведаю...*

1. Пра якую прафесію апавядае пісьменнік? У якім творы?

а) «— Гэта, сынок, гаспадар, — растлумачыла маці. — Ты ж дапамагаеш нам і бычкоў пасвіць, і сена валкаваць, і ваду ў карыты з кранаў пускаеш...»;

б) «— Добра, — падтрымаў сыночка тата, — наша прафесія — самая патрэбная на зямлі. Мая брыгада пачала будаваць новы магазін. Ты хацеў бы нам дапамагчы?

— Яшчэ як хацеў бы, — узрадаваўся Паўлік»;

в) З Вольгай Паўлаўнай цікава.
Не злуецца, не крычыць.
Мы, як быццам для забавы,
Разам вучымся лічыць;

г) «Волька спрытна ўзабралася на табурэтку, знайшла на шафе соду, шчодра сыпанула ў цеста»;

д) Трэба жыта падкарміць,
Поле хораша ўзараць,
Да сяўбы падрыхтаваць.
А яшчэ павінен ён
Ведаць, дзе пасеяць лён,
Кукурузу і ячмень...



Правообладатель Национальный институт образования

2. Назавіце творы, да якіх зроблены гэтыя малюнкі.






3. Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі твораў і іх героямі.

| Героі | Твор |
|---|---|
| А) Бабуля, Волька, яе сябры;<br>Б) бацька, Рома;<br>В) Сяргей, Максімка, бацька, маці;<br>Г) Паўлік, тата | 1) «Паўлік-будаўнік»;<br>2) «Маленькі фермер»;<br>3) «Тата ў Ромы — аграном»;<br>4) «Воля-кулінарка» |



Правообладатель Национальный институт образования

### *Разумею, магу растлумачыць...*

1. Чым аб'яднаны ўсе вершы і апавяданні гэтага раздзела? Вызначце іх агульную тэму і асноўную думку.

2. Назавіце творы, якія вам найбольш спадабаліся і запомніліся.

3. Якія мудрыя ўрокі вы атрымалі дзякуючы вывучаным творам?

4. Як вы думаеце, чаму пытанне выбару прафесіі ў жыцці чалавека застаецца адным з самых галоўных?

5. Суаднясіце прозвішчы аўтараў і назвы іх твораў:

| | |
|---|---|
| *І. Муравейка* | «Маленькі фермер» |
| *І. Аношкін* | «Паўлік-будаўнік» |
| *М. Даніленка* | «Буду настаўнікам» |
| *Эдзі Агняцвет* | «Воля-кулінарка» |

6. Складзіце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

няма | хлеба | Без працы | чаго | шукаці.

без працы, | без крылаў. | што | птушка | Чалавек

а | густа, | дзе | лянота — | там | Дзе | шчырая | там | праца — | пуста.



Правообладатель Национальный институт образования

7. Адгадайце загадкі.



Уключыў як след прылады
Ды націснуў на педаль —
І пайшоў, пайшоў удаль!
За разораю разору
Вёў плугамі я ў прасторы.
І рабілася за мною
Поле мяккаю раллёю...
*Кастусь Цвірка.*

Кожны купіць, хто не лысы,
Кубак, конаўку ці місу.
Нарасхват ідзе тавар.
А зрабіў яго ... .
*У. Паўлаў.*

... з цэглы дом кладзе.
Сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
Працы больш шаноўнае.
*А. Астрэйка.*







Правообладатель Национальный институт образования

# МІРНА ЖЫЦЬ — ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ



**Мы пазнаёмімся** з вершамі і апавяданнямі пра мужнасць і гераізм людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра жыццё дзяцей у пасляваенны час і ўшанаванне герояў.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ вызначаць час і месца падзей, што паказаны ў мастацкіх творах;
- ✓ назіраць, хто распавядае ў творы — аўтар ці яго герой;
- ✓ тлумачыць учынкі дзейных асоб, выказваць свае адносіны да іх;
- ✓ выразна чытаць верш з гэтага раздзела і перадаваць яго настрой;
- ✓ падрабязна пераказваць частку апавядальнага твора па складзеным плане.

**Варта задумацца.** Чаму людзі і ў нашы дні даглядаюць помнікі героям і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны?



Правообладатель Национальный институт образования

## Творчае заданне

1. Разгледзьце малюнак на с. 77.

2. Адкажыце на пытанні.

1) Якая пара года адлюстравана на малюнку?

2) Дзе знаходзяцца хлопчык і дзяўчынка?

3) Чым яны заняты? Раскажыце.

4) Ці падыходзіць малюнак да назвы раздзела «Мірна жыць — шчаслівым быць»? Дакажыце.

5) Каму мы павінны быць удзячнымі за мірнае неба над галавой? Знайдзіце падказку на малюнку.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце гукі [ч], [р], [ц'], [дз'].

### Тры чарадзеі

Тры **ч**а**р**а**дз**еі
На све**ц**е **ж**ыву**ц**ь.
Ут**р**ох яны сею**ц**ь,
Ут**р**ох яны жну**ц**ь...
Тры **ч**а**р**а**дз**еі
На све**ц**е **ж**ыву**ц**ь.
Іх П**р**а**ц**аю,
Д**р**ужбаю,
Мі**р**ам
Заву**ц**ь.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Зажу́раны*** — сумны, маркотны.
***Ку́ля*** — невялікі свінцовы прадаўгаваты снарад для стральбы з ручной агнястрэльнай зброі і кулямёта.
***Грудо́к*** — невялікая горка, узгорак.
***Паго́жы*** — ясны, цёплы.
***Удава́*** — жанчына, у якой загінуў або памёр муж.



## МІХАСЬ ПАЗНЯКОЎ

## Помнік герою

Герою з Масквы ці з-за Дона,
Майму земляку ці з-за Волгі
Пад юным зажураным клёнам
Стаіць абеліск ля дарогі.
Далёка ад роднага краю
Сцяжыну яго абарвала
Тупая варожая куля.
Хавала яго не матуля.
Салют не грымеў над грудком —
Хавалі салдата цішком
Уночы жанчыны-сялянкі
На мужнай зямлі партызанскай.

Не быў ён знаёмы нікому,
Застаўся таму невядомы.


Правообладатель Национальный институт образования



У Дзень Перамогі пагожы
Абнеслі грудок агароджай.
Чырвоная гордая зорка
Заззяла над сумным пагоркам.
Удовы з адноўленай вёскі
Пасеялі побач валошкі,
Маленькую лаўку зрабілі
І клён малады пасадзілі.

Расце ён, салдату спявае
Пра маці, што дома чакае.

1. Які настрой выклікаў у вас верш Міхася Пазнякова?
2. У памяць аб кім стаіць каля дарогі абеліск? Чаму на ім не напісана імя пахаванага салдата?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Якую гісторыю з жыцця героя расказвае паэт? Прачытайце адпаведны ўрывак з твора.
4. Па чым можна здагадацца, што салдата пахавалі беларускія жанчыны? Адказ падмацуйце радкамі з верша.
5. Як ушаноўваюць памяць аб загінуўшым? Прачытайце.
6. Разгледзьце ілюстрацыю да верша (с. 80). Якімі радкамі з твора яе можна падпісаць? Прачытайце.
7. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша з адпаведнымі настроем і інтанацыяй.

**Давайце абмяркуем.** Чаму людзі павінны помніць пра герояў Вялікай Айчыннай вайны?

***Лютава́ць*** — праяўляць жорсткасць.
***Во́бмацкам*** — пры дапамозе дотыку, абмацваючы.
***Не мог даўме́цца*** — не мог здагада́цца.
***Канту́зіць*** — нанесці ўдар або траўму арганізму (пры выбухах, разрывах снарадаў) без пашкоджання покрыва цела.
***Лазарэ́т*** — невялікая бальніца пры вайсковай часці.
***Байні́ца*** — адтуліна ў сцяне абарончых збудаванняў для стральбы.



Правообладатель Национальный институт образования

***Ро́спач*** — пачуццё крайняй безнадзейнасці, упадак духу, выкліканы якім-небудзь няшчасцем, непрыемнасцю.
***Дако́р*** — папрок, выказаны каму-небудзь за што-небудзь.



**АЛЕСЬ МАХНАЧ**

## Юныя абаронцы

Непрытомнага байца асцярожна знялі з насілак і паклалі на цагляную падлогу.

— Яго моцна канту́зіла... Выбухам... — пакідаючы лазарэт, сказаў Пеця Васільеў.

У пагранічнай крэпасці над Бугам трэці дзень лютавала вайна. Усе, хто мог трымаць у руках зброю, былі там, наверсе, дзе несціхана грымеў бой.

У падвальным лазарэце было цесна. Не хапала матрацаў, шынялёў, і параненых клалі на голую падлогу.

Палоска святла, што скупа прабівалася ў лазарэтнае акенца-байніцу, пацямнела ад дыму. Каб не хадзіць вобмацкам, Валя Зе́нкіна і Нюра Кіжава́тава запалілі самаробную газоўку — з гільзы артылерыйскага снарада.



Правообладатель Национальный институт образования

— Загадваю! Не дазваляць цяжкараненым займаць абарону! — прагучаў з цёмнага праёма дзвярэй голас лейтэнанта Андрэя Кіжаватава. Да вайны лейтэнант быў начальнікам пагранічнай заставы, а цяпер разам з іншымі камандзірамі кіраваў абаронай аднаго з участкаў Брэсцкай крэпасці.

Нюра здагадалася: бацька прыходзіў, каб сказаць, што ён жывы і здаровы. І, вядома, глянуць на яе, дачку: як яна тут, у гэтым пекле?

Тым часам Валя Зенкіна ўзяла газоўку, падышла да байца, якога прынеслі Пеця Васільеў і яго сябры — юныя санітары.

— Пагранічнік...

Гэта слова балюча, як стрэмка, кальнула Нюру. Яна кінулася да кантужанага байца, глянула





Правообладатель Национальный институт образования

ў твар і пазнала пасыльнага, які часта прыбягаў да яе бацькі.

— Бабронак!.. З нашай заставы...

Дзяўчынкі прыўзнялі пагранічніка, далі яму вады. Баец застагнаў, расплюшчыў вочы, затрымаў здзіўлены позірк на Нюры.

— Вы ў лазарэце, — сказала Нюра. — Вас не параніла, толькі кантузіла...

Пагранічнік заварушыўся, пачаў абмацваць рукамі падлогу вакол сябе. Дзяўчынкі адразу здагадаліся, што яго так непакоіць.

— Ваша вінтоўка тут, не трывожцеся, — загаварыла Валя. — Вось яна... Толькі вам нельга ўставаць, ляжыце...

Баец, здавалася, не чуў, што кажуць дзяўчынкі. Ён усё яшчэ не мог здаўме́цца, як трапіў сюды, у гэты цёмны падвал. Дзе яго баявыя таварышы? Ён з цяжкасцю падняўся і, абапіраючыся на вінтоўку, ступіў крок-другі да вузкай палоскі святла ў сцяне. І пахіснуўся. Вось-вось упадзе, зноў страціць прытомнасць. Валя падтрымала яго, давяла да акенца-байніцы.

Бой працягваўся. Спакойна, каб не прамахнуцца, баец пачаў страляць па фашыстах, якія наступалі ад Цярэспальскай бра́мы. Яму цяжка было трымацца на нагах, і, каб не асунуцца на



Правообладатель Национальный институт образования

падлогу, ён яшчэ болей пада́ўся наперад, высунуўся з акенца. Непадалёку ўпала міна, і моцным выбухам адкінула байца назад, у падвал.

Дзяўчынкі схіліліся над пагранічнікам, які ляжаў, нібы мёртвы. Пульс ледзь праслухоўваўся. Сэрца білася з перабоямі. Каб не трывожыць двойчы кантужанага байца, сяброўкі не сталі пераносіць яго на ранейшае месца, у глыб падвала. Знайшлі шынель, згарнулі, паклалі пад галаву.

Валя была ў роспачы. Выходзіць, яна парушыла загад камандзіра: памагла цяжка кантужанаму пагранічніку дабрацца да акенца-байніцы. Ён сам не змог бы дайсці, заняць абарону. Ці выжыве ён цяпер?





Правообладатель Национальный институт образования

Нюра Кіжаватава моўчкі абняла сяброўку: словы дакору тут былі лішнія. Яна і сама парушала суровы загад камандзіраў: «Дзецям сядзець у падвалах!» Калі абаронцам крэпасці было вельмі цяжка, Нюра разам з іншымі выходзіла з падвала, паўзла туды, дзе грымеў жорсткі бой: выцягвала з-пад агню і перавязвала параненых, падносіла байцам патроны і гранаты.

Але сказаць пра ўсё гэта сяброўцы Нюра не паспела. Пеця Васільеў і яго сябры-санітары прынеслі новага параненага. І трэба было яго ратаваць.

1. Калі і дзе адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні?
2. Як выглядаў падвальны лазарэт? Прачытайце.
3. Назавіце дзейных асоб твора.
4. Якую дапамогу аказвалі дзеці цяжкараненым байцам? Ці лёгка было дзецям дапамагаць дарослым? Чаму?
5. Што даведаліся вы пра кантужанага пагранічніка Бабронка? Перакажыце гэты эпізод. Як гэты ўчынак характарызуе байца?
6. З якой мэтай пісьменнік расказаў пра гэты эпізод з часоў Вялікай Айчыннай вайны?
7. Разгледзьце ілюстрацыі да апавядання (с. 83, 85). Якія эпізоды з твора на іх адлюстраваны? Якія рысы характару абаронцаў Брэсцкай крэпасці імкнуўся перадаць мастак?



Правообладатель Национальный институт образования

## Творчае заданне

Пазнаёмцеся ў інтэрнэце з інфармацыяй пра ўдзел дзяцей у абароне Брэсцкай крэпасці. Раскажыце аб прачытаных фактах сваім аднакласнікам.

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Эдуарда Белагурава «Дзеці вайны».





Правообладатель Национальный институт образования

**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Каго вы бачыце на карціне? Куды, на вашу думку, накіроўваюцца дзеці?

2) Які гістарычны час адлюстраваў мастак? Па якіх дэталях можна здагадацца, што ідзе вайна?

3) Якімі мастак малюе дзяцей? Апішыце іх.

4) Чаму адна з дзяўчынак, што ў цэнтры, узяла з сабой у дарогу ляльку? Пра што гэта сведчыць?

5) Што ўвасабляе сабой абпалены фотаздымак з маці і дзіцём, які ўзняўся ў паветра?

6) Чаму на карціне пераважаюць чорна-жоўтыя фарбы? Што яны сабой увасабляюць?

7) Якія пачуцці і настрой выклікала ў вас карціна «Дзеці вайны»?

8) Што хацеў сказаць мастак сваім палатном?

***Гарма́та*** — агульная назва артылерыйскай зброі.

***Бліндá́ж*** — абарончае збудаванне для ўкрыцця салдат ад агню праціўніка.

***Спадзеючы́ся*** — мець надзею на што-небудзь.

***Фронт*** — тут: лінія баявога размяшчэння войск; узброеныя сілы, якія знаходзяцца на месцы баёў.



Правообладатель Национальный институт образования

## ІВАН МУРАВЕЙКА

# На вайне і не такое бывае (Подзвіг като́ Марціна)

А за́раз, дзеткі, я вам раскажу пра като́-франтавіка́. Так, так, франтавіка. Я яго не выдумаў, ён быў на са́май справе.

Быў месяц май. На нашым участку фронта панава́ў спакой — ні мы, ні фашысты не атакава́лі. Перастрэлка, вядома, вялася — аўтаматы і кулямёты, мінамёты і гарматы часам падава́лі свой голас. А ў той дзень стаяла цішыня.

Надышоў абед. Я сядзеў ля бліндажа́ і апетытна еў прасяную кашу з мясам. Бачу — за некалькі крокаў ад мяне сядзіць худы чорны кот і з зайздрасцю глядзіць на мой кацялок. Не цяжка было зразумець — галодны. За нямецкай лініяй абароны віднелася невялікая вёска. З яе кот і прыбег. Адкуль жа яшчэ? Мабыць, спачатку заглянуў на нямецкую кухню, але яго прагналі, і ён накіраваўся да нас. Я паклаў на траву лыжку кашы і кавалачак мяса — кот накінуўся на яду, нібы на жывую мыш.

Наеўся і лёг на бліндаж, задрамаў. Раптам недалёка разарвалася варожая міна, потым — другая, трэцяя. Кот усхапіўся і імгненна залез на самую верхавіну бярозы, якая ўзвышалася ля бліндажа.



Правообладатель Национальный институт образования



— Захацеў паглядзець, адкуль міны ляцяць, — засмяяліся салдаты.

Зноў настала цішыня. Кот злез з бярозы і пабег да нямецкіх акопаў.

— Пайшоў у ата́ку.

Пра ката́ мы хутка забыліся, а ён пра нас — не. На наступны дзень, таксама ў час абеду, ён з'явіўся перад маімі вачыма. Я зноў яго сытна накарміў, а ён зноў улёгся на бліндажы. Немцы не стралялі, і Марцін — так я назваў свайго новага баявога таварыша — спаў спакойна і моцна. Я ўспомніў: «Захацеў паглядзець, адкуль міны ляцяць», і ў маёй галаве зашавялілася цікавая задумка. Карацей кажучы, напісаў алоўкам на паперцы такія словы: «Дарагі таварыш! Пера-



Правообладатель Национальный институт образования

дай свайму кату́ наступныя да́ныя: дзе стаяць фашысцкія гарматы і мінамёты. Сяржант Перапечка». Дастаў з рэчавага мяшка бінт і прышыў да яго баявое заданне невядомаму патрыёту. Потым разбудзіў Марціна і забінтаваў яму «параненую» шыю. «Бяжы да свайго гаспадара», — падштурхнуў ката́.

Пафантазіруйце, як будуць развівацца падзеі далей. Ці прынясе кот Марцін каштоўныя звесткі байцам? Ці сустрэне сяржант Перапечка гаспадара ката́?

Прызнацца, я не спадзяваўся, што хтосьці прачытае маю запіску і выканае заданне. Калі назаўтра Марцін прыбег да нас падсілкава́цца, то на яго шыі бінту не было. Мы ўсе захваляваліся: а што, калі «паранены» кот зацікавіў ворага?

Марцін паабедаў, адпачыў і пабег дадому.

Наступнага дня мы чакалі з нецярпеннем. Прынеслі абед, але ніхто не дакрануўся да ежы: усе глядзелі ў бок вёскі.

— Бяжыць!

— Бяжыць!

На шыі ў Марціна бялеў бінт. Разбінтавалі і прачыталі: «Мінамёты стаяць за могілкамі. Ля кароўніка — пяць гармат. Віця».



Правообладатель Национальный институт образования



А праз некалькі дзён мы пачалі наступленне. Вёску ўзялі з ходу: дапамаглі знаёмы Марцін і невядомы Віця. Калі наша рота праходзіла праз вёску, я заглядáў у кожны двор, спадзеючыся ўбачыць храбрых памочнікаў. Ля перадапошняй хаты стаяў рыжагаловы хлапчук гадоў дзесяці-дванаццаці з чорным катом на руках.

— Марцін! — паклікаў я.

Рота спынілася, а кот саскочыў з хлапчуковых рук і пабег да мяне.

— А ты — Віця? — звярнуўся да хлопчыка камандзір роты.

— Ага...

— Шчыры дзякуй табе ад камандавання. І тваймý Марціну.

Камандзір дастаў з павозкі бохан хлеба і бляшанку тушонкі. Аддаў Віці.

Прайшло ўжо шмат гадоў, а я помню неверагодны вы́падак з франтавога жыцця.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў гэтым апавяданні?
2. Хто расказвае ў творы: пісьменнік ці яго герой? Пацвердзіце сваю думку радкамі з тэксту.
3. Пра якіх дзейных асоб апавядае пісьменнік? Што вы даведаліся пра сяржанта Перапечку? Хлопчыка Віцю? Ката Марціна?
4. Падрабязна перакажыце ўрывак пра тое, як з дапамогай ката́ сяржант Перапечка здабыў важныя даныя.
5. Як камандзір аддзячыў храбрым памочнікам?
6. Вызначце асноўную думку апавядання.
7. Разгледзьце ілюстрацыі (с. 90 і 92). Суаднясіце іх з тэкстам: прачытайце ўрыўкі, якія праілюстраваны. Які з малюнкаў адпавядае двум эпізодам з апавядання? Чаму?

## Творчае заданне

Пашукайце ў інтэрнэце інфармацыю пра ўдзел жывёл у падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Раскажыце яе сваім аднакласнікам.

***Абру́с*** — пакрывала для стала; настольнік.
***Бо́рзда*** — хутка.
***Грэх*** — тут: заганны, ганебны ўчынак; учынак, які выклікае асуджэнне.
***Схамяну́цца*** — раптам успомніць пра штонебудзь.



Правообладатель Национальный институт образования

***Спаку́са*** — тое, што выклікае неадольнае жаданне, цягу да чаго-небудзь.
***Мро́іўся*** — тут: бачыўся, уяўляўся ў думках, сніўся.



**БАРЫС САЧАНКА**

## Хлеб

Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны.

...Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга любавалася ім, паварочвала і так і гэтак, нюхала, разглядала, нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб — сапраўдны жытні хлеб, спечаны з чыстай, без ніякае домесі, мукі. Потым яна нейк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напалам: адзін кавалак дала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу, то павячэрае...

Сама ж, узяўшы капані́цу, пайшла на агарод акопваць бульбу.

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І вядома, ані не наеўся, толькі растравіў яшчэ больш свой голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці



Правообладатель Национальный институт образования

сабе месца, чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус, узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў, не заўважыў, як пальцы мае самі, не пытаючы ў мяне на тое згоды, адшчыпнулі яшчэ крошачку. Маленечкую, малюпасенькую крошачку…





Правообладатель Национальный институт образования

...Схамяну́ўся я тады, калі на маёй далоні асталася абшчы́панаая з усіх бакоў скарыначка. Што я нарабіў? Што скажуць маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, акрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб яго і духу не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была такая вялікая, такая неадольная, што я не вытрымаў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот...

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна... Ён цэлы дзень быў на дзялянцы, абсякаў суччa, зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць. Дома есці ў нас не было нічога. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў: няйнакш яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я...

---

Ці пакараюць хлопчыка за з'едзены хлеб?
Ці нагадаюць яму пра яго грэх? Чаму?

---

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым мяне не папракнулі. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы.

Але калі я цяпер успамінаю той хлеб, які належала з'есці брату і які з'еў я, і той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца



Правообладатель Национальный институт образования

не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не было ў мяне такога ўспаміну, каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы я быў тады галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!

*Паводле Б. Сачанкі.*

1. Хто, на вашу думку, з'яўляецца апавядальнікам — пісьменнік ці яго герой?
2. У які час адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні «Хлеб»?
3. На колькі частак маці падзяліла хлеб? Чаму?
4. Чаму ўчынак, здзейснены галоўным героем апавядання ў дзяцінстве, хвалюе яго ўсё жыццё?
5. Як маці і Толік аднесліся да ўчынка малога?
6. З якой мэтай Барыс Сачанка расказаў чытачам пра пасляваенны выпадак з жыцця?
7. Разгледзьце ілюстрацыю да твора на с. 95. Да якой часткі тэксту яна адносіцца? Прачытайце адпаведныя радкі.
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне апавядання. З якой інтанацыяй патрэбна чытаць апошнія два абзацы твора? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

**Давайце абмяркуем.** Прыгадайце, ці рабілі вы ў сваім жыцці непрыемныя ўчынкі, як галоўны герой апавядання. Раскажыце пра іх. Ці было вам потым сорамна за такі ўчынак? Чаму?

## Загадка

Мы яго ў паход бяром.
А ён есці-піць не просіць.
І не мы яго нясём —
Гэта ён нас спраўна носіць.

*У. Паўлаў.*



***Патла́ты*** (хлопец) — з доўгімі нерасчэсанымі валасамі.
***Пунсаве́ць*** — рабіцца чырвоным.
***Каменяло́мня*** — месца распрацоўкі выкапнёвага будаўнічага каменю і іншых горных парод.
***Канцла́гер*** — канцэнтрацыйны лагер: месца ізаляцыі зняволеных і ваеннапалонных.
***А́льпы*** — горы ў Заходняй Еўропе.
***Як след прасты́ў*** — бясследна знік, прапаў.
***Скава́пны*** — скупы, прагны да багацця.
***Берасця́нка*** — невялікая лясная птушка атрада вераб’іных; зяблік.
***Жаўна́*** — назва чорнага і зялёнага дзятлаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## МІХАСЬ ДАНІЛЕНКА

### Ордэн

Вясновым днём ішоў я з Максімкам праз гарадскі сквер. Пасвіствалі шпакі. На вершаліне сухадрэвіны стукаў дзюбай дзяцел. Раптам Максімка крануў мяне за руку:

— Дзед, глядзі.

На пляцоўцы перад памостам, дзе ў летнія вечары граў аркестр, стаяў патлаты хлопец. На дошчачцы, што вісела над раскладным стэлажом са значкамі, было напісана: «Куплю ордэн Айчыннай вайны». Максімку, відаць, вельмі ўразілі словы «куплю ордэн», і ён аж застыў каля стэлажа.





Правообладатель Национальный институт образования

— Ці ж можна купляць святое? — запытаўся я ў патлатага.

Той звысоку акінуў мяне абыякавым позіркам і працадзіў скрозь зубы:

— А твая якая справа?..

Мы пайшлі далей, і я расказаў Максімку, як у вайну армія, у якой я ваяваў, трапіла ў акружэнне. Мы стаялі да апошняга. Шмат маіх аднапалчан загінула. А потым я, палонны, працаваў у каменяломнях, уцякаў з канцла́гера. Удвух з сябрам прабіраліся мы па заснежаных Альпах, а ў далінах уладарыла вясна, пунсавелі кветкі...

Максімка ведаў: дома, у чырвонай скрыначцы, ляжыць мой ордэн Айчыннай вайны другой ступені. І таму пасля доўгага маўчання запытаўся:

— Дзед, а твой ордэн для цябе — святое?

— Святое, унучак, святое, — адказаў я. — Мне нават страшна падумаць, што ён можа трапіць у нечыя сквапныя рукі... Не стане мяне на свеце, ордэн захаваеш ты — як памяць пра дзеда.

Калі мы вярталіся з прагулкі, патлатага хлопца з раскладным стэлажом у скверы ўжо не было. Як след прастыў. І здавалася, што званчэй спявалі берасцянкі і падавала голас жаўна. Нават сонца свяціла ярчэй.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Хто распавядае гісторыю пра ордэн: пісьменнік ці яго герой? Чаму вы так думаеце?
2. Якую непрыемную карціну ўбачылі дзед і яго ўнук Максімка ў гарадскім скверы? Як абодва аднесліся да аб'явы? Падмацуйце адказ радкамі з твора.
3. Як характарызуе патлатага хлопца размова з дзедам? Перачытайце іх гутарку па ролях.
4. Што расказаў дзед унуку пра сваё ваеннае жыццё? Перакажыце.
5. Якi запавет даў дзед Максімку? Прачытайце.
6. Чаму ў старога чалавека ўзняўся настрой, калі ён не ўбачыў на ранейшым месцы патлатага хлопца са стэлажом?
7. Разгледзьце ілюстрацыю на с. 99. Знайдзіце і прачытайце ўрывак, які ёй адпавядае.

**Давайце абмяркуем.** Паразважайце, навошта патлаты хлопец хацеў купіць ордэн. Ці захоўваюцца ў вашых сем'ях рэліквіі? Раскажыце пра іх. Што з'яўляецца рэліквіяй? Як апынулася яна ў вашай сям'і? Чаму вашы родзічы яе зберагаюць?

Падрыхтуйце выразнае чытанне твора па ролях і праінсцэніруйце яго.

## ПРЫКАЗКА

- Той герой, хто за Радзіму гарой.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. Ад чыйго імя вядзецца расказ у кожным з наступных твораў — ад імя аўтара ці яго героя?

а) У апавяданні Міхася Даніленкі «Ордэн»;
б) у апавяданні Алеся Махнача «Юныя абаронцы»;
в) у апавяданні Івана Муравейкі «На вайне і не такое бывае (Подзвіг ката́ Марціна)»;
г) у апавяданні Барыса Сачанкі «Хлеб».
Дакажыце сваю думку адпаведнымі радкамі з твораў.

2. У якім з вывучаных твораў апавядаецца:

а) пра галоднае пасляваеннае жыццё;
б) дапамогу дзяцей цяжкараненым байцам у час абароны Брэсцкай крэпасці;
в) цікавы выпадак дапамогі ката́ салдатам фронту?

3. У якім творы асуджаецца ганебны ўчынак юнака: пакупка ім узнагароды часоў Вялікай Айчыннай вайны?

4. Назавіце адпаведны твор, у якім адзін з герояў паказаны пісьменнікам так:

а) «Калі наша рота праходзіла праз вёску, я заглядаў у кожны двор, спадзеючыся ўбачыць храбрых памочнікаў. Ля перадапошняй хаты стаяў рыжагаловы хлапчук



Правообладатель Национальный институт образования

гадоў дзесяці-дванаццаці з чорным катом на руках»;

б) «Спакойна, каб не прамахнуцца, баец пачаў страляць па фашыстах, якія наступалі ад Цярэспальскай брамы. Яму цяжка было трымацца на нагах, і, каб не асунуцца на падлогу, ён яшчэ болей пада́ўся наперад, высунуўся з акенца. Непадалёку ўпала міна, і моцным выбухам адкінула байца назад, у падвал»;

в) Далёка ад роднага краю
Сцяжыну яго абарвала
Тупая варожая куля.
Хавала яго не матуля.
Салют не грымеў над грудком —
Хавалі салдата цішком
Уночы жанчыны-сялянкі
На мужнай зямлі партызанскай;

г) «Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус, узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне».



Правообладатель Национальный институт образования

5. Да якіх твораў зроблены гэтыя малюнкі? Назавіце аўтараў твораў.






6. Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі твораў і іх героямі.

| Героі | Твор |
|---|---|
| А) Віця, яго кот і сяржант Перапечка;<br>Б) дзед, унук Максімка і патлаты хлопец;<br>В) маці, Толік і хлопчык-расказчык;<br>Г) Нюра, Валя і кантужаны пагранічнік | 1) «Хлеб»;<br>2) «Юныя абаронцы»;<br>3) «На вайне і не такое бывае (Подзвіг ката́ Марціна)»;<br>4) «Ордэн» |



Правообладатель Национальный институт образования

7. Вызначце, у які час — ваенны ці пасляваенны — адбываюцца падзеі, апісаныя ў творах «Помнік герою», «Хлеб», «Ордэн».

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Чым аб’яднаны вершы і апавяданні гэтага раздзела?

Выберыце адказ:

а) творы аб’яднаны тэмай ваеннага і пасляваеннага часу;

б) дапамагаюць пазбавіцца ад дрэнных якасцей характару;

в) выступаюць супраць вайны;

г) вучаць захоўваць памяць пра герояў і ахвяр вайны.

2. У чым жах вайны? Прывядзіце прыклады з прачытаных твораў.

3. Пастаўце пункты плана ў той паслядоўнасці, у якой адбываліся падзеі ў апавяданні Міхася Даніленкі «Ордэн».

П л а н

У гарадскім скверы.
Патлаты хлопец знік.
Расказ дзеда пра вайну.
Дзедаў наказ унуку.
Размова з патлатым хлопцам.



Правообладатель Национальный институт образования

## На свяце Дня Перамогі

Разгледзьце малюнак і складзіце па ім апавяданне.




*Словы і словазлучэнні для выкарыстання:* напярэдадні 9 Мая, прапанова класнага кіраўніка, сонечная і бязвоблачная раніца, прыйшлі ўсім класам, плошча, Вечны агонь, шмат людзей, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, уручылі кветкі, песні, усмешкі і вясёлы настрой, пачуццё ўдзячнасці і гонару.



Правообладатель Национальный институт образования

# ХТО СПОРТАМ ЗАЙМАЕЦЦА, ТОЙ СІЛЫ НАБІРАЕЦЦА



**Мы пазнаёмімся** з творамі на спартыўную тэму, даведаемся пра ролю фізічнай культуры і спорту ў жыцці людзей.

**Мы працягнем вучыцца:**

✓ знаходзіць у паэтычных творах матэрыял для характарыстыкі героя;

✓ назіраць, хто распавядае — аўтар ці яго герой;

✓ выразна чытаць вершы гэтага раздзела, перадаваць іх настрой і рытм.

**Варта задумацца.** Чаму людзі падарожнічаюць па славутых мясцінах сваёй Радзімы?

Навошта выконваць ранішнюю гімнастыку ці сур’ёзна займацца спортам?



Правообладатель Национальный институт образования

*Прынёманне* — край, прырода каля ракі Нёман.



## ВІКТАР ШЫМУК

### Канікулы

Ля рэчкі —
Росныя сцяжынкі,
Сцяжынкі —
У казачным бары.
У паходзе хлопчыкі,
Дзяўчынкі,
У паходзе
Школьныя сябры.

Яны ідуць па родным
Краі,
Яны Прынёманнем
Ідуць,
Бярозкі іх
Здалёк вітаюць,
Ім песні жаўрукі
Пяюць.

О любы край,
Ты днём і ўночы
Такі прыгожы,
Дарагі,





Правообладатель Национальный институт образования

Як хораша
Палямі крочыць,
Пазнаць
Сцяжынкі і шляхі.

Пабыць у пушчах
Ля зямлянак,
Штоараслі
Даўно травой,
Дзе мужна
Нашы партызаны
Ішлі на ворагаў
У бой.

Пабыць ля Нёмана
І Буга,
Пабыць ля Сожа
І Дняпра,
Прайсціся полем,
Лесам, лугам
І песні пець
Каля кастра...





1. Чаму школьныя сябры адправіліся ў паход па родным краі? Падмацуйце сваю думку радкамі з верша.
2. Дзе героі твора падарожнічалі? Што іх цікавіць? Як гэта характарызуе юных вандроўнікаў?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Па чым можна здагадацца, што вучні падарожнічаюць па ўсёй нашай краіне? Дакажыце адпаведнымі радкамі з верша.
4. Як сама прырода адносіцца да падарожнікаў? Прачытайце адпаведныя словы.
5. Якое слова дапамагае ўявіць бярозкі як жывых істот?
6. Вызначце асноўную думку верша.
7. Разгледзьце ілюстрацыі да верша. Ці адпавядаюць яны зместу твора? Чаму? Абмяркуйце, якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да твора.
8. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Як вы плануеце адпачываць летам? Ці былі вы ўдзельнікамі паходаў па родным краі? Калі, з кім і дзе вы падарожнічалі?

***Акцябро́нак*** — вучань 2, 3 або 4-га класа, які рыхтуецца стаць піянерам.
***Ко́ўдраў ска́тка*** — коўдры, скручаныя ў трубку і звязаныя па канцах для нашэння праз плячо.
***Му́ляць*** — ціснуць, націраць.
***Ко́лікі*** — рэзкі, востры боль у жываце або ў баку.
***Вярста́*** — старая мера даўжыні, роўная 1 км 60 м.



Правообладатель Национальный институт образования

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

## Сябры ў паходзе



Як выходзілі сябры
У дарогу на зары,
Бралі яны рэчы,
Клалі іх за плечы:

Грышка ўзяў палатку,
Цішка — коўдраў скатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Толькі выйшлі за сяло
Цішку муляць пачало,
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.



Правообладатель Национальный институт образования



І гадзіну не ішлі —
Стася колікі ўзялі.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Як мінулі вёрстаў пяць,
Стала моцна прыпякаць.
Просіць Лёўка Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клу́нак Лёўкаў,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.



Правообладатель Национальный институт образования

За гарой, дзе бор драмаў,
Раптам Янка закульгаў.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Паднясі, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клунак Лёўкаў,
І сачкі, й бляшанку,
І… самога Янку!

1. Якія пачуцці выклікаў у вас Грышка? Чаму?
2. Ці можна назваць Грышку, Цішку, Стася, Лёўку і Янку сапраўднымі турыстамі?
3. Чаму ва ўсіх дзяцей, акрамя Грышкі, не хапіла фізічных сіл несці неабходныя рэчы?
4. Разгледзьце ілюстрацыі да верша (с. 111, 112). Вызначце, дзе на іх акцябронак Янка, а дзе — Грышка. Прачытайце радкі, якія адносяцца да ілюстрацыі.
5. Для чаго паэт расказаў гэту смешную гісторыю?
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора, перадаючы́ яго жартоўны настрой.

**Давайце абмяркуем.** Як вы разумееце выраз «быць сапраўдным турыстам»? З якой мэтай людзі займаюцца турызмам?



Правообладатель Национальный институт образования

*Кла́сці на лапа́ткі* — пры дужанні валіць саперніка на спіну; перамагаць у якой-небудзь справе, спрэчцы.
*Брусы́* — гімнастычны снарад у выглядзе дзвюх паралельных перакладзін, замацаваных на стойках.



## МІКОЛА МАЛЯЎКА

### Будзем біць рэкорды

На спартыўных зборах
І ў паходах
Мы сталеем,
Мы дужэем
З кожным годам.

Дружна трэніруемся,
Натхнёна,
Чэмпіёны школы
І раёна.

Не здаёмся мы
Без барацьбы ніколі
На дарожцы бегавой
І на футбольным полі,
На катку
І на лыжні,
На брусах
І скураны́м кані.



Правообладатель Национальный институт образования

Мы — барцы
З жалезнай хваткай,
І кладзём мы
Многіх
На лапаткі.
Хутка плаваем,
Высока скачам.
А прайграем —
Крыўдна,
Ды не плачам.

Сіла волі ёсць,
Характар цвёрды —
Будзем біць
Сусветныя рэкорды.





1. Хто расказвае ў вершы: паэт ці герой-спартсмен? Па чым вы здагадаліся?
2. Якія віды спорту згадваюцца ў творы? Прачытайце.
3. Чаму герой называе ўсіх спартсменаў «барцамі з жалезнай хваткай»? Як вы разумееце гэты выраз? Растлумачце.
4. Якімі рысамі характару надзелены сам герой?
5. У чым заключаецца карысць спорту для фізічнага здароўя людзей? Прачытайце ў доказ адпаведныя радкі.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Разгледзьце ілюстрацыю на с. 115. Якія віды спорту паказаў на ёй мастак?
7. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша, захоўваючы неабходную інтанацыю, тон, паўзы і лагічныя націскі. Абмяркуйце якасць чытання сваіх аднакласнікаў.

## Творчае заданне

1. Разгледзьце малюнкі.

2. Складзіце апавяданне па малюнках, апорных словах і словазлучэннях.













Правообладатель Национальный институт образования

*Апорныя словы і словазлучэнні:* разбіў шыбу ў акне, паскардзіўся бацьку, падышлі да стадыёна, гулялі ў футбол, зацікавіўся футболам, пасля ўрокаў, футбольная секцыя, прыгожая форма, навучыўся падбіваць мяч, пасля працы, радасныя бацькі, шчаслівы сын.

3. Як вы ацэньваеце ўчынак бацькі? Выкажыце свае думкі.

**Давайце абмяркуем.** Якім відам спорту займаецеся вы? Раскажыце пра свае спартыўныя заняткі на аснове пытанняў.

1) Якую спартыўную секцыю вы наведваеце? Дзе яна знаходзіцца?

2) Хто з'яўляецца вашым трэнерам?

3) Чым вы займаецеся на занятках? Раскажыце парадак (ход) іх правядзення.

4) Ці падабаюцца вам гэтыя трэніроўкі? Чаму?

5) Якіх поспехаў у спорце вы ўжо дабіліся? Аб чым марыце?




***Зы́чыць*** — жадаць, выказваць каму-небудзь пажаданні.

***Фі́ніш*** — канцавы пункт дыстанцыі пры спартыўных спаборніцтвах на хуткасць.



Правообладатель Национальный институт образования



## МІКОЛА МАЛЯЎКА

### Велагонка

Гоншчыкам удачы
Зычыць наўздагон
Гарадок дзіцячы —
Цэлы стадыён.

Гоншчыкі не кволыя,
Гоншчыкі пакуль
Едуць — кола ў кола,
Едуць — руль у руль.

Хто вянок прымерае?
Хто з іх переможа?
Ні адзін наперад
Вырвацца не можа.

А вянок гатовы —
У руках дзяўчынак,
Праўда, не лаўровы —
З бэзавых галінак.

Гоншчыкі тым часам —
Добра бачна зблізку —
Перасеклі разам
Фінішную рыску.



Правообладатель Национальный институт образования

Гарадок дзіцячы
Зноў прыйшоў у рух:
Як вянок удачы
Падзяліць на двух?

Пашумелі крышку
І рашылі ўсе:
Хай вянок без крыўды
Носяць па чарзе.




1. Дзе адбыліся спаборніцтвы паміж гоншчыкамі? Хто на іх прысутнічаў?
2. Як аўтар характарызуе веласіпедыстаў? Прачытайце адпаведныя радкі з твора.
3. Якім чынам узнагародзілі двух пераможцаў?
4. Патлумачце сэнс радкоў: «Едуць — кола ў кола», «Едуць — руль у руль».
5. Якія малюнкі можна зрабіць да верша? Вусна апішыце іх.
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша. Пастарайцеся перадаць эмацыянальны настрой твора.



Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Аляксандры Сайкінай «Юныя мушкецёры».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Хто адлюстраваны на карціне?

2) Па чым можна здагадацца, што спартсмены назіраюць за паядынкам сваіх таварышаў?

3) Хто з юных фехтавальшчыкаў з'яўляецца цэнтральнай фігурай карціны? Апішыце яго партрэт.

4) Якія дэталі сведчаць, што юнакі валодаюць моцным характарам і імкненнем да перамогі?

5) Ці падабаецца хлапчукам займацца спортам? Па чым гэта відаць?

6) Якой тэме прысвечана карціна Аляксандры Сайкінай?



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. У якіх паэтычных творах галоўныя героі характарызуюцца так?

а) Мы — барцы
З жалезнай хваткай,
І кладзём мы
Многіх
На лапаткі.
Хутка плаваем,
Высока скачам.
А прайграем —
Крыўдна,
Ды не плачам;

б) Гоншчыкі не кволыя,
Гоншчыкі пакуль
Едуць — кола ў кола,
Едуць — руль у руль.

2. З якіх твораў узяты ўрыўкі? Пра які від спорту апавядаецца ў іх?

а) О любы край,
Ты днём і ўночы
Такі прыгожы,
Дарагі,
Як хораша
Палямі крочыць,
Пазнаць
Сцяжынкі і шляхі;



Правообладатель Национальный институт образования

б) Гоншчыкі тым часам —
Добра бачна зблізку —
Перасеклі разам
Фінішную рыску;

в) Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клунак Лёўкаў,
І сачкі, й бляшанку,
І... самога Янку!

3. Якім прачытаным творам адпавядаюць малюнкі?









Правообладатель Национальный институт образования

4. Ад чыйго імя вядзецца расказ у паэтычным творы — ад аўтара ці яго героя:

а) у вершы Міколы Маляўкі «Будзем біць рэкорды»;

б) у вершы Міколы Маляўкі «Велагонка»;

в) у вершы Ніла Гілевіча «Сябры ў паходзе»;

г) у вершы Віктара Шымука «Канікулы»?

Дакажыце сваю думку радкамі з вершаў.

5. Якія словы прапушчаны ў паэтычных радках?

Сіла волі ёсць,<br>Характар … —<br>Будзем біць<br>Сусветныя … .

***Разумею, магу растлумачыць…***

1. Што аб'ядноўвае вывучаныя вершы, пералічаныя ў заданні 4?

2. Чаму ў персанажаў з верша Ніла Гілевіча «Сябры ў паходзе» вандроўка па родным краі праходзіла цяжка? Хто ў гэтым быў вінаваты?

3. Якую карысць прыносяць заняткі любімым відам спорту? Паразважайце.



Правообладатель Национальный институт образования

## Дарагія сябры!



Вось і закончылася літаратурнае падарожжа з цікаўным казачным Буслікам.

Спадзяёмся, што вы на працягу навучальнага года з карысцю правялі з ім час: сябравалі з беларускім словам, з захапленнем чыталі творы, прыдумвалі гісторыі, развучвалі вершы, вучыліся весці дыялогі.

Раскажыце, якія моманты гэтага падарожжа былі самымі захапляючымі.

Успомніце, з якімі аўтарамі вы пазнаёміліся. Якія творы вас асабліва ўразілі? Якія героі сталі вашымі дарадчыкамі?

Наперадзе ў вас — лета. З задавальненнем наведвайце бібліятэкі, кнігарні. Выбірайце і чытайце кнігі. Няхай кніга застаецца вашым надзейным сябрам!

Да сустрэчы ў 4-м класе!

*Аўтар.*



Правообладатель Национальный институт образования

# З м е с т

## ДОБРАЕ ДЗІЦЯ БАЦЬКОЎ ДУМКІ ЗГАДВАЕ

Недалікатны сын *(Беларуская народная казка)* ........................................ 4
Зайздросны дзядзька *(Беларуская народная казка)* ........................................ 9
Іван Муравейка. Лыжкай па лбе ............ 13
Іван Шамякін. Пастух ........................... 16
**Калыханкі** ........................................ 22
Ходзіць коцік па палях... ....................... 22
Баю-баінку-баю... ................................. 22
**Забаўлянкі-пацешкі** ............................ 24
Кую, кую ножку... ................................. 24
Ягорачка ............................................. 24
Генадзь Аўласенка. Чыя мама лепшая? .... 25
*Праверце сябе* .................................... 27

## ВЯСЕННІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Максім Багдановіч. Перад паводкай ......... 31
Адам Русак. Мама ................................. 33



Правообладатель Национальный институт образования

**Вясновыя песні** ................................ 35
Вясна красна, адкуль прыйшла... ............ 35
Ты, пчолачка ярая ................................ 36
Вясна *(Паводле Якуба Коласа)* .............. 38
Уладзімір Карызна. Лісце прыляцела ....... 41
Мікола Мятліцкі. Пытанні ..................... 43
*Праверце сябе* .................................... 45

## ХТО ХОЧА ШЧАСЛІВА ЖЫЦЬ, ТОЙ ПРАЦУ ПАВІНЕН ЛЮБІЦЬ

Лёгкі хлеб *(Беларуская народная казка)* ... 50
Эдзі Агняцвет. Буду настаўнікам ........... 58
Іван Муравейка. Паўлік-будаўнік ........... 60
Міхась Даніленка. Маленькі фермер ........ 63
Змітрок Марозаў. Тата ў Ромы — аграном ... 66
Іван Аношкін. Воля-кулінарка ................ 70
*Праверце сябе* .................................... 73

## МІРНА ЖЫЦЬ — ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ

Міхась Пазнякоў. Помнік герою ............. 79
Алесь Махнач. Юныя абаронцы .............. 82
Іван Муравейка. На вайне і не такое бывае (Подзвіг ката́ Марціна) ......................... 89



Правообладатель Национальный институт образования

Барыс Сачанка. Хлеб ............................ 94
Міхась Даніленка. Ордэн.......................... 99
*Праверце сябе* ................................ 102

## ХТО СПОРТАМ ЗАЙМАЕЦЦА, ТОЙ СІЛЫ НАБІРАЕЦЦА

Віктар Шымук. Канікулы ........................ 108
Ніл Гілевіч. Сябры ў паходзе .................. 111
Мікола Маляўка. Будзем біць рэкорды ..... 114
Мікола Маляўка. Велагонка .................... 118
*Праверце сябе* ................................ 121

Дарагія сябры! ................................ 124

Спіс выкарыстаных крыніц



Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Жуковіч** Мікалай Васільевіч

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках
Частка 2

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Мастак *В. В. Дударэнка*
Вокладка мастака *В. В. Дударэнкі*
Мастацкі рэдактар *К. А. Тарасевіч*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *М. У. Колас, Г. М. Мазіна, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 02.11.2023. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,36. Ул.-выд. арк. 5,0. Тыраж 135 234 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014. Пр. Незалежнасці, 79/1, 220013, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования